

ЦІКАВІНКІ ФОРУМУ ENERGY EXPO **5**

СПАДЧЫНА ДЛЯ КОЦІКА І САБАЧКІ **9**



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 КАСТРЫЧНІКА 2023 г. АЎТОРАК № 206 (30086)

**ЦЫТАТА ДНЯ**



**Аляксандр ТАРАСЕНКА, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач:**

*«Вопыт арганізацый аховы здароўя, набыты ў 2020—2022 гадах, у перыяд захваральнасці на COVID-19, дае магчымасць гаварыць аб тым, што кадры гатовы да росту захваральнасці на вострыя рэспіраторныя інфекцыі. Папаўненне матэрыяльна-тэхнічнай базы, калі была неабходнасць у гэтым, ужо адбылося. У цэлым сістэма аховы здароўя гатова да эпідсезона. Высокі ўзровень захваральнасці чакаецца традыцыйна ў студзені — лютым, магчыма, і ў сакавіку».*

# Мамы, жонкі, прыгажуні



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

У Мінску адбыўся фінал конкурсу прыгажосці сярод шматдзетных жанчын «Краса Беларусі — 2023». Пераможцай стала Дар'я УГНІВЕНКА з Мінска. Тытул першай віцэ-місіс дастаўся мінчанцы Аксане КАНАШЫЦ, другой віцэ-місіс конкурсу названа Ірына ГРАЧУХІНА з Віцебска.

**КОРАТКА**

- **Памяць ахвяр Мінскага гета ўшанавалі ў мемарыяльным комплексе «Яма».**
- У Беларусі за тыдзень 10 тысяч грамадзян прышчапіліся ад грыпу.
- **У нашай краіне накапана больш чым 788 тысяч тон бульбы.**



- БУТБ зацікаўлена ў супрацоўніцтве з вытворцамі палімернай прадукцыі з Валгаградскай вобласці.
- **У Беларусі ў 2024 годзе пабудуюць 1,4 млн кв. м жылля з дзяржпадтрымкай.**



Спажывец

## ЗАСЕКІ СОНЦА

### Баравікі, брусніцы, журавіны: колькі каштуюць дары лесу гэтай восенню?

**Як бы ні развівалася індустрыя вытворчасці прадуктаў харчавання, і сёння застаюцца (і, верагодна, застануцца заўсёды) тыя прадукты, што маюць ярка выяўленую сезоннасць. Тэрмін іх нарыхтоўкі кароткі, і гэта надае ім адмысловы шарм. Цяпер якраз час назапасіцца восеньскімі дарамі лесу, якія забяспечаць нас здароўем на доўгую халодную зіму.**



Гэты год па праве лічыцца грыбным.

**ІДЗЁМ У ГРЫБЫ**

2023 год з поўным правам можна назваць грыбным. Пасля некалькіх гадоў, калі лес не песціў аматараў «ціхага палявання» дарамі, сёлета на буйных рынках і маленькіх кірмашах грыбы ў шырокім асартыменце. І не звычайныя сыраежкі, якім былі рады пакупнікі ў мінулым годзе. Паўнаважкія баравікі і чырвонагаловікі — то-бок тыя грыбы, якія лічацца элітнымі. А таксама рыжыкі, апенькі, махавікі, падзялёнкі, лісічкі... Прадаюць іх вёдрамі, вядзерцамі, літровымі слоікамі і пластмасавымі кантэйнерамі. Цэны на белыя грыбы высокія (ад 50 рублёў), нягледзячы на багацце прапановы, але баравікі заўсёды дарагія. Падасінавікі прадаюць па 15 рублёў за кілаграм буйных — сапраўдных асілкаў, маленькія каштуюць 25 за кіло.

СТАР. 8

Як нас дураць

## «СПЕЦАПЕРАЦЫІ» МАХЛЯРОЎ

### Узбройваемся ведамі, каб не папоўніць статыстыку ахвяр кіберашуканцаў



**У Гомелі следчымі завершана расследаванне рэзанансная справы: пенсіянерка па ўказаннях ашуканцаў падпаліла два аўтамабілі. Па легендзе аферыстаў, гамяльчанка павінна была дапамагчы вывесці на чыстую ваду нядобрасумленных працаўнікоў банка. Яны быццам бы афармілі на пенсіянерку 10 крэдытаў і збіраліся збегчы за мяжу. Каб дапамагчы затрымаць злачынцаў, жанчыну пераканалі ўзяць крэдыты амаль на 50 тысяч рублёў і перавесці на ўказаныя рахункі. Пенсіянерка пагадзілася.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – СА СТАРЫМ СЯБРАМ!

Ідзе падпіска на І паўгоддзе 2024 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2024 года, у падарунак чатыры календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.

Эканамікс

# САЦЫЯЛЬНАЯ СТАБІЛЬНАСЦЬ І ЎСТОЙЛІВЫ РУХ НАПЕРАД

## Раман ГАЛОЎЧАНКА расказаў аб прагнозе сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на будучы год

**Ключавыя пытанні эканамічнай палітыкі на 2024 год былі абмеркаваны ў Палаце прадстаўнікоў падчас сустрэчы прэм'ер-міністра і членаў урада з парламентарыямі абедзвюх палат. Па традыцыі ў «нулявым чытанні» быў разгледжаны блок бюджэтных дакументаў: праекты законаў «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2024 год», «Аб змяненні Падатковага кодэкса Рэспублікі Беларусь» і «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2024 год».**



Фота БелТА.

### Стабільна і дынамічна

Кажучы аб бягучай эканамічнай сітуацыі і тэндэнцыях, якія складваюцца ў эканоміцы, Раман Галоўчанка адзначыў, што вынікі гэтага года фарміруюць базу, ад якой адштурхоўваюцца пры прагназаванні будучага года. За дзевяць месяцаў 2023 года прынята каля 40 прававых актаў, накіраваных на падтрымку канкрэтных прадпрыемстваў машынабудаўнічага, металургічнага і нафтахімічнага комплексаў, прадпрыемстваў лёгкай і дрэваапрацоўчай прамысловасці. За кошт сродкаў бюджэту кампенсавана 740 млн рублёў працэнтаў па крэдытах, выдадзеных банкамі прадпрыемствам і арганізацыям рэальнага сектара. Сістэмная падтрымка як заўсёды аказвалася арганізацыям аграпрамысловага комплексу. За кошт бюджэтных крыніц і льготных крэдытаў аказана дапамога сельгасарганізацыям на агульную суму 317 млн рублёў для закупкі збожжакўборачных камбайнаў, меліярацыйнай тэхнікі і дайльнага абсталявання. На будаўніцтва і рэканструкцыю малочнатаварных комплексаў дадаткова накіравана 680 млн рублёў.

«Для захавання стабільнай работы прымаліся рашэнні, якія накіраваны на забеспячэнне сыравінай айчынных вытворцаў, рэгуляваўся свабодны вываз такой сыравіны, — адзначыў Раман Галоўчанка. — Для лёгкай прамысловасці гэта, перш за ўсё, ільноваланка і шкуры буйной рагатай жывёлы. У мэтах падтрымкі дрэваапрацоўчай прамысловасці ўведзена ліцэнзаванне імпарту ДСП, ДВП, шматслойнай паперы, кардону. У выніку прынятых мер, нягледзячы на ўсе абмежаванні, эканоміка дэманструе ўстойлівасць і адаптыўнасць да знешніх шокаў. Больш за тое, дынаміка эканамічнага росту адноўлена і захоўвае станоўчы трэнд».

З мая бягучага года штомесяц прырастае ВУП. Па выніках 9 месяцаў тэмп росту склаў 103,5 %. Узнаўляецца інвестыцыйная актыўнасць. Прымаюцца меры па пошуку крыніц і механізмаў інвестыцыйнага фінансавання інфраструктурных праектаў, звязаных з будаўніцтвам жылля, дарог, станцый абезжалезвання. Па словах прэм'ер-міністра, падрыхтаваны неабходныя рашэнні кіраўніка дзяржавы аб фінансаванні аб'ектаў дзяржаўных і рэгіянальных інвестыцыйных праграм, якія маюць сацыяльнае значэнне. Як падкрэсліў Раман Галоўчанка, аб'ёмы гэтай падтрымкі дастаткова высокія.

Што ў гэтым кірунку зроблена за бягучы год? Адрамантавана больш за 1700 кіламетраў аўтамабільных дарог, праведзена рэканструкцыя сямі маставых збудаванняў. У эксплуатацыю ўведзены фізкультурна-аздараўленчыя комплексы ў Фаніпалі і ва Уздзе. Адна з самых вялікіх школ у краіне пачала сваю работу ў Гродне. Адкрыты шэсць новых дзіцячых садкоў, завершана будаўніцтва новага будынка паліклінікі Нясвіжскай цэнтральнай раённай бальніцы, рэканструяваны чатыры раённыя бальніцы. Па словах кіраўніка ўрада, да 7 лістапада ў эксплуатацыю будуць уведзены новая паліклініка ў Гродне і радыялагічны корпус Магілёўскага абласнога анкалагічнага дыспансера.

### Павелічэнне экспарту і нізкі ўзровень беспрацоўя

Кажучы аб экспарце, Раман Галоўчанка паведаміў, што за восем месяцаў экспарт тавараў вырас на 8,2 % да аналагічнага перыяду 2022 года. «Прынятыя сумесна з Нацыянальным банкам меры дазволілі захаваць на прымальным узроўні параметр гадавой інфляцыі, якая знізілася ў верасні да 2 %, — дадаў ён. — Па выніках 2023 года мэтавы паказчык па індэксе спажывецкіх цэн будзе забяспечаны ў рамках прагнознага параметра».

Прэм'ер-міністр звярнуў увагу і на стабільную сітуацыю на фінансавым рынку краіны. На валютным рынку склалася чыстая прапанова замежнай валюты. Аб'ём золатавалютных рэзерваў не змяніўся.

Раман Галоўчанка канстатаваў, што рынак працы характарызуецца нізкім узроўнем беспрацоўя. «Але больш важным індыкатарам стану рынку працы з'яўляецца колькасць занятых у эканоміцы, — удакладніў ён. — Назіраецца зніжэнне гэтага паказчыка. Тут працуюць розныя фактары: як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя. Але разам з тым гэты працэс не носіць ніякага надзвычайнага характару. У цэлым, прадпрыемствы вострага дэфіцыту кадраў не адчуваюць».

З мэтай выхаду на станоўчую дынаміку плануецца рэалізаваць меры, накіраваныя на максімальнае задзейнічанне працоўных рэсурсаў, якія ёсць у краіне, і прыцягненне ў краіну кваліфікаванай замежнай рабочай сілы. Некаторыя крокі ў гэтым напрамку ўжо зроблены.

### Павялічыцца мінімальны заробак

Прыярытэтам урада застаюцца даходы грамадзян, якасць і ўзровень іх жыцця. Як і ў мінулыя гады, паслядоўна рэалізоўваюцца меры, накіраваныя на падтрымку бюджэтнікаў, у тым ліку іх мэтавыя катэгорыі (урачы, настаўнікі), а таксама нізкааплатных работнікаў.

«У бягучым годзе мы двойчы прымалі рашэнні аб пераглядзе базавай стаўкі, якая прымяняецца для аплаты працы бюджэтнікаў, і базавага акладу, ад якога залежыць аплата працы дзяржслужачых і ваеннаслужачых, — нагадаў Раман Галоўчанка. — Таксама рэалізаваны шэраг «кропкавых» рашэнняў. На ўстанаўленне дадатковых стымулюючых выплат асобным катэгорыям работнікаў з бюджэту накіравана больш за 1 млрд рублёў. Са студзеня 2023 года дадатковую прыбаўку ў аплаце працы атрымалі настаўнікі, выхавацелі, урачы, сярэдні медыцынскі персанал, а таксама работнікі спартыўнай галіны, сацыяльнага абслугоўвання і культуры. Гэтыя галіны будуць у фокусе ўвагі і ў наступным годзе».

Для падтрымкі нізкааплатных катэгорый з пачатку года амаль на 15 % павялічана мінімальная заработная плата. Плануецца, што ў 2024 годзе яна павялічыцца яшчэ на 13 % і будзе ўстаноўлена ў памеры 626 рублёў. Шэраг комплексных планавых мерапрыемстваў, накіраваных на павышэнне заробку ў адпаведнасці з ростам прадукцыйнасці працы, таксама рэалізоўваюцца ў рэальным сектары эканомікі.

### Рост дабрабыту грамадзян

Кажучы аб прагнозе сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на будучы год, кіраўнік урада падкрэсліў, што мэтавая задача, на якой грунтуецца прагноз наступнага года, — забеспячэнне ўстойлівых тэмпаў росту эканомікі і росту дабрабыту насельніцтва. «Узровень эканамічнага росту, які прагназуецца, перавышае сярэднія тэмпы росту сусветнай эканомікі, а таксама чаканы рост ВУП нашага асноўнага гандлёва-эканамічнага партнёра — Расійскай Федэрацыі, — адзначыў ён. — У якасці мэтавай задачы для Нацыянальнага банка і ўрада таксама прадугледжваецца прыняцце мер па абмежаванні інфляцыі на ўзроўні не больш як 6 %».

Асноўнымі крыніцамі эканамічнага росту па-ранейшаму застаюцца інвестыцыі. Будзе працягнута рэалізацыя інвестпраектаў і тэхнічнае пераасначэнне прадпрыемстваў. «Па-першае, гэта 163 праекты, якія рэалізоўваюцца ў рамках праграмы «Адзін раён — адзін праект», — канкрэтызаваў Раман Галоўчанка. — Радуе, што ў многіх раёнах праект не адзін, іх некалькі».

Працягнецца будаўніцтва жылля і інфраструктуры да яго. За кошт усіх крыніц фінансавання будзе пабудавана не менш як 4,4 млн кв. метраў жылля, у тым ліку з дзяржпадтрымкай — 1,4 млн кв. метраў, арэнднага жылля — практычна 500 тыс. кв. метраў.

Асаблівая ўвага будзе ўдзелена інфраструктуры ў рэгіёнах. Запланавана будаўніцтва 20 дзіцячых садкоў, 12 школ, 12 фізкультурна-аздараўленчых комплексаў, двух басейнаў, 18 аб'ектаў аховы здароўя. Плануецца прафінансаваць 150 станцый абезжалезвання вады і 16 ачышчальных збудаванняў, адрамантаваць 1600 кіламетраў рэспубліканскіх аўтамабільных дарог, 2700 кіламетраў мясцовых дарог, рэканструяваць сем мастоў.

Асноўным прыярытэтам эканамічнай палітыкі па-ранейшаму будзе павышэнне ўзроўню дабрабыту грамадзян. У наступным годзе рост рэальнай заработнай платы запланаваны на ўзроўні 103,9 %. У цэлым па эканоміцы намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата складзе 2087 рублёў. У бюджэтным сектары — 1634 рублі.

### У аснове — сацыяльная накіраванасць

Кажучы аб падыходах да фарміравання праекта рэспубліканскага бюджэту на 2024 год, Раман Галоўчанка паведаміў, што было прынята ўзгодненае рашэнне фарміраваць бюджэт на аснове сцэнарыя прагнозных параметраў развіцця эканомікі. «Сацыяльная накіраванасць — прыярытэт бюджэту наступнага года, — падкрэсліў прэм'ер-міністр. — Запланавана павелічэнне расходаў кансалідаванага бюджэту на адукацыю (на 13,8 %), ахову здароўя (на 11,6 %), заработную плату. Фонд аплаты працы павялічыцца на 12,4 %. Пры гэтым будзе забяспечана своечасовае выкананне ўсіх абавязацельстваў па пагашэнні дзяржаўнай пазыкі. Бюджэтная падтрымка экспарцёраў будзе павялічана на 20 %».

Праект Закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2024 год» прадставіў міністр фінансаў Юрый Селівёрстаў.

**Вераніка КАНЮТА.**

### У тэму

Як адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА,** прадстаўлены рэспубліканскі бюджэт на будучы год з'яўляецца збалансаваным дакументам, які аптымальна ўлічвае суадносіны даходаў і расходаў. «Ён адпавядае асноўнай задачы развіцця эканомікі ў 2024 годзе па захаванні сацыяльнай стабільнасці, забеспячэнні эфектыўнага выкарыстання існуючых рэсурсаў у мэтах устойлівага развіцця краіны, — удакладніў спікер ніжняй палаты парламента. — Змяненні падатковага заканадаўства арыентаваны на забеспячэнне прынцыпу сацыяльнай справядлівасці, стварэнне роўных умоў падаткаабкладання для суб'ектаў гаспадарання, аптымізацыю адміністрацыйных працэдур, павышэнне рацыянальнасці і стабільнасці падатковай сістэмы».

Дэпутацкі корпус актыўна ўдзельнічаў у пасяджэннях міжведамаснай рабочай групы па падрыхтоўцы прагнозу асноўных параметраў эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь і праекта рэспубліканскага бюджэту на 2024 год, у пасяджэннях Савета Міністраў і яго Прэзідыума пры абмеркаванні адпаведных праектаў. «Такая форма работы дазволіла парламентарыям яшчэ на стадыі распрацоўкі ўнесці свае заўвагі і прапановы, — заўважыў Уладзімір Андрэйчанка. — Яны датычыліся макраэканамічных паказчыкаў, якія выкарыстоўваюцца пры фарміраванні праектаў рэспубліканскага і мясцовых бюджэтаў, аптымізацыі дзяржаўных расходаў і забеспячэння сацыяльнай абароны грамадзян, сістэмы падаткаабкладання».

**Старшыня Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах Палаты прадстаўнікоў Людміла НІЖЭВІЧ** паведаміла, што са сродкаў рэспубліканскага бюджэту ў дарожны фонд запланавана накіраваць 1,9 млрд рублёў, што на 28 % вышэй, чым летась. «Новым кірункам будзе выкарыстанне сродкаў на набыццё дарожнай тэхнікі, — удакладніла дэпутат. — На гэтыя мэты плануецца накіраваць каля 40 млн рублёў. Акрамя таго, у 4,7 раза павялічана аб'ём сродкаў, якія перадаюцца ў мясцовыя бюджэты ў выглядзе субвенцый на бягучы рамонт мясцовых дарог, — 700 млн рублёў».

Па словах парламентарыя, захоўваецца падтрымка малазабяспечаных і шматдзетных сем'яў. «Закладваюцца сродкі ў аб'ёме 382,5 млн рублёў на выплату сямейнага капіталу, — канкрэтызавала яна. — Акрамя таго, будзе працягнута работа па падтрымцы жыллёвага будаўніцтва, ільготных працэнтаў па крэдытах у рамках 242-га Указа, а таксама субсідзіраванне для маладых, шматдзетных сем'яў. На гэтыя мэты ў бюджэце прадугледжаны 1 млрд рублёў».

Запланавана выплата надбавак для сярэдняга медыцынскага персаналу ўстаноў аховы здароўя, а таксама супрацоўнікам устаноў адукацыі і іншых бюджэтных арганізацый.

Мясцовы час

# МІР І ЛЁН

## Чым жыве Карэліцкі раён

**Безумоўна, галоўнае багацце і гонар раёна — гэта людзі, якія старанна, добрасумленна працуюць на карысць дзяржавы, сцвярджае старшыня Карэліцкага райвыканкама Генадзь ШАТУЕЎ. Але ёсць у нас яшчэ адно багацце — лён, вытворчасць якога складае аснову эканомікі раёна. Нездарма блакітныя кветкі намаляваны на гербе раёна.**



Фота з архіва райвыканкама.

***— Генадзь Мікалаевіч, спытайце ў любога беларуса, чым знакаміты Карэліцкі раён, і ён адразу ўспомніць пра Мірскі замак. Але ў раёне ёсць і свая прамысловасць, і развітая сельская гаспадарка. Дык чым на самай справе ганарыцца Карэліцкі раён?***

— У першую чаргу — сваімі працаўнікамі. Напрыклад, сёлета сельскагаспадарчымі арганізацыямі раёна вырашчана ў першапачатковым апрыходаванай вазе 105 610 тон збожжа без уліку кукурузы. Мы ганарымся тым, што нашы хлебаробы ўнеслі дастойны і важкі ўклад у каравай вобласці і краіны. Амаль 7,5 працэнта атрыманага збожжа ў вобласці — гэта ўклад аграрыяў Карэліцкага раёна. Наш раён — адзін з чатырох раёнаў Гродзеншчыны, якія перасягнулі статысячную мяжу намалоту збожжа.

Калі казаць пра ўраджайнасць, мы таксама ўваходзім у чацвёрку лідараў Гродзеншчыны пасля Гродзенскага, Берасгавіцкага і Мастоўскага раёнаў. Яна, дарэчы, у сельскагаспадарчых арганізацыях Карэліцкага раёна склала 60,3 ц/га. У СВК «Маяк-Заполле» ў 2023 годзе была дасягнута ўраджайнасць 93,1 ц/га, у КСУП «Племзавод «Карэлічы» — 100,6 ц/га.

44 экіпажы ў Карэліцкім раёне намалацілі звыш 1000 тон збожжа, 15 — звыш 2000 тон. Акрамя таго, 37 кіроўцаў перавезлі звыш 1000 тон збожжа, 13 — звыш 2000 тон. Адзін сушыльны комплекс перапрацаваў звыш 3000 тон збожжа, шэсць — звыш 4000 тон.

Сёлета атрыманы вельмі добры ўраджай рапсу. Адзначу, што мы павялічылі пасяўныя плошчы пад гэтую культуру на чатыры тысячы гектараў. Сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі намалочана 16 605 тон рапсу ў бункернай вазе, што складае 108,2 % да ўзроўню мінулага года. З гэтай задачай дастойна справіліся арганізацыі «Жухавічы» (60,3 ц/га), «Племзавод «Карэлічы» (68,7 ц/га), «Свіцязянка-2003» (60,7 ц/га).

Трэба адзначыць, што павялічылася вытворчасць амаль усіх відаў жывёлагадоўчай прадукцыі.

Так, вытворчасць малака за 8 месяцаў 2023 года — 62 061,4 тоны, або 108,4 % да ўзроўню 2022 года. Надоена на карову 4752 кг малака плюс 366 кг да ўзроўню мінулага года. Вытворчасць буйной рагатай жывёлы склала 4713,6 тоны, або 108,8 працэнта да ўзроўню 2022 года. Вытворчасць свіней у жывой вазе склала 7316,4 тоны, або 111,8 працэнта да ўзроўню 2022 года.

За студзень — жнівень 2023 года тэмп росту вытворчасці валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі склаў 106,5 працэнта. Сельгасарганізацыямі раёна выпушчана прадукцыі на суму 197,7 млн рублёў, у тым ліку прадукцыі жывёлагадоўлі на суму 112,4 млн рублёў і прадукцыі раслінаводства на суму 85,3 млн рублёў.

Дадам, што за студзень — жнівень 2023 года ў цэлым па раёне выпушчана прамысловай прадукцыі на суму 17,4 млн рублёў, або 113,3 працэнта да аналагічнага перыяду 2022 года. Дарэчы, цяпер у Карэлічах будуецца яшчэ адно прамысловае прадпрыемства, якое будзе выпускаць электрычнае абсталяванне. А гэта яшчэ 20 працоўных месцаў. Аб'ект будзе ўведзены ў эксплуатацыю ў 2024 годзе.

***— А што датычыцца вашай галоўнай сельскагаспадарчай культуры і яе перапрацоўкі?***

— ААТ «Карэлічы-Лён», добра вядомае ў краіне, з'яўляецца асноўным валаўтваральным прадпрыемствам. Яно вырабляе доўгае і кароткае льновалакно, алей і жмых, кастрабрыкеты. Мадэрнізацыя прадпрыемства дала магчымасць вырабляць якасную прадукцыю і ажыццяўляць яе адгрузку на экспарт.

Удзельная вага прадпрыемства ў агульным аб'ёме прамысловасці раёна за студзень — жнівень 2023 года складае 74,6 працэнта. Таварная прадукцыя ў асноўным прамысловым прадпрыемстве ААТ «Карэлічы-Лён» склала 13 млн рублёў, або 116,8 працэнта да ўзроўню 2022 года.

Выкананне дзяржаўнага заказу за студзень — жнівень 2023 года па доўгім валакне склала 140,1 працэнта, па кароткім — 128,7 працэнта. На экспарт пастаўлена 571 тона валакна на суму 872,2 тысячы долараў ЗША, у тым ліку кароткага валакна 511 тон і 60 тон доўгага валакна.

***— Узровень якасці жыцця людзей напрамую залежыць ад стану сацыяльнай інфраструктуры. Як яна развіваецца ў Карэліцкім раёне?***

— Медыцынскае абслугоўванне насельніцтва забяспечвае Карэліцкая цэнтральная раённая бальніца. Медыцынская дапамога арганізавана на базе дзвюх паліклінік і дзвюх бальніц. Першасную медыка-санітарную дапамогу ў раёне аказваюць 11 ФАПаў, пяць амбулаторый урача агульнай практыкі. Закуплены тры аўтамабілі хуткай медыцынскай дапамогі. На тэрыторыі раёна дзейнічае Жухавіцкі дом інтэрнат для састарэлых і інвалідаў.

Сістэма адукацыі Карэліцкага раёна прадстаўлена 23 установамі адукацыі, сярод якіх дзевяць сярэдніх школ і два базавыя школы. У раёне налічваецца сем дзіцячых садоў, ёсць установа спецыяльнай адукацыі — Цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі Карэліцкага раёна. Таксама працуюць такія ўстановы, як Карэліцкі раённы цэнтр творчасці дзяцей і моладзі, Сацыяльна-педагагічны цэнтр Карэліцкага раёна, Дзіцячы аздараўленчы лагер «Вясёлка».

Ёсць у нас і ўстанова сярэдняй спецыяльнай адукацыі — Мірскі дзяржаўны каледж, дзе, між іншым, вучацца дзеці амаль з усёй краіны. Таксама ў раёне функцыянуюць Дзіцячаюнацкая спартыўная школа, Карэліцкі раённы вучэбнаметадычны кабінет.

У цэлым забяспечваецца выкананне мерапрыемстваў дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка на 2021—2025 гады».

У дзевяці ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі на III ступені арганізавана вывучэнне вучэбных прадметаў на павышаным узроўні. Усяго профільным навучаннем ахоплена 74,4 працэнта навучэнцаў X і XI класаў. Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі функцыянавала пяць педагагічных груп, 1 клас і 2 групы аграрнай накіраванасці, дзе мэтанакіравана рыхтуюцца спецыялісты сельскай гаспадаркі. Бо сельгастэхніка і абсталяванне ўдасканальваюцца хуткімі тэмпамі. Прадоўжана супрацоўніцтва з Акадэміяй Міністэрства ўнутраных спраў у рамках работы з праваым класам.

У Карэліцкім раёне функцыянуе тры дзяржаўныя ўстановы культуры і дзве дзяржаўныя ўстановы адукацыі ў сферы культуры са статусам юрыдычнай асобы. Дзейнічаюць Карэліцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці (15 клубных устаноў), Карэліцкі раённы краязнаўчы музей, Карэліцкая раённая бібліятэка (13 бібліятэчных устаноў), дзіцячыя школы мастацтваў у Карэлічах і Міры.

14 калектываў у раёне маюць званне «народны». Статус гісторыка-культурнай каштоўнасці нематэрыяльнай праявы творчасці чалавека мае Мірская батлейка.

Інфраструктуру раёна прадстаўляюць тры гасцініцы, восем аб'ектаў грамадскага харчавання, 13 суб'ектаў аграэкатурызму, тры музеі. 38 аб'ектаў унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны: сем помнікаў археалогіі, 14 помнікаў архітэктуры, пяць помнікаў гісторыі, дзевяць помнікаў мастацтва і тры помнікі нематэрыяльнай спадчыны.

Гандлёвае абслугоўванне насельніцтва ажыццяўляюць 145 гандлёвых аб'ектаў, з іх 51 размешчаны ў сельскай мясцовасці. Для жыхароў сельскіх населеных пунктаў, дзе адсутнічае стацыянарная гандлёвая сетка, арганізавана работа аўтакрам.

***— Як у раёне ідзе будаўніцтва новага жылля? Якія аб'екты з'явіліся ў райцэнтры і аграгарадках?***

— За студзень — верасень 2023 года за кошт усіх крыніц фінансавання ўведзена ў эксплуатацыю 2547 кв. м агульнай плошчы жылых памяшканняў, або 94,3 працэнта да гадавога задання. На будаўніцтва жылля за мінулы перыяд накіравана 4 286 000 рублёў уласных сродкаў грамадзян і 296 тыс. рублёў крэдытных рэсурсаў.

У 2022 годзе ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай «Дарогі Беларусі» на 2021—2025 гады пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю аўтамабільная дарога «Абход г. п. Мір». Працягласць дарогі — 4,57 кіламетра, фактычны кошт — 15,4 млн рублёў.

Дзякуючы гэтаму аб'екту для жыхароў г. п. Мір створана больш спрыяльнае асяроддзе для пражывання, палепшана экалагічная сітуацыя, паколькі транзітны транспарт будзе перанакіраваны на новы ўчастак аўтамабільнай дарогі.

***— Візітная картка раёна — Мірскі замак. Што робіцца дзеля захавання гісторыка-культурнай спадчыны і развіцця турыстычнага патэнцыялу?***

— Дзеля прыцягнення большай колькасці турыстаў у нас рэалізаваны шэраг маштабных міжнародных выставачных праектаў, такіх, напрыклад, як «Ultima Ratio Regum. Беларусь у Паўночных войнах сярэдзіны XVII — пачатку XVIII стагоддзяў», «Ігнат Дамейка — Тытан навукі», прысвечаны 215-годдзю з дня нараджэння сусветна вядомага вучонага, выстава ваеннага касцюма з калекцыі Дзяржаўнага музея-запаведніка «Царскае Сяло» пад назвай «З імператарскага гардэроба», прысвечаная 100-годдзю заканчэння Першай сусветнай вайны.

Праводзяцца значныя культурныя праекты: «Летнія музычныя вечары ў Мірскім замку», «Вялікі тэатр Беларусі запрашае» сумесна з Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатрам оперы і балета Рэспублікі Беларусь, канцэрты лаўрэатаў Рэспубліканскага фестывальконкурсу класічнай музыкі «Музычны Мір», «Кніжныя сустрэчы ў Мірскім замку» і іншыя.

Адмысловае месца ў дзейнасці музея займае фарміраванне гістарычнай свядомасці і гісторыка-патрыятычнае выхаванне, захаванне і дэманстрацыя дакладных ведаў аб мінулым, заснаваных на нацыянальных і культурных рэдкасцях.

Штогод праводзяцца традыцыйныя культурныя мерапрыемствы для дзяцей — дзіцячыя калядныя балі, а для дарослых — Сусветны баль у першыя дні Новага года. А ўвогуле, у адносінах да Мірскага замка ў нас вялікія планы.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**

Надвор'е

# МОКРЫ СНЕГ, ГАЛАЛЁДЗІЦА НА ДАРОГАХ, ДЫ ЯШЧЭ І ТУМАН...

## Па гэтых метэаўмовах тыдзень можа стаць часам «бляхара»

**На апошнім тыдні кастрычніка надвор'е працягне апускаць нас у глыбокую восень. Франтальныя раздзелы і вільготныя паветраныя масы з зайздросным пастаянствам будуць закідваць у нашу краіну шырокія палі воблачнасці. А з іх на нас будуць ліцца (сыпацца) ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, а з улікам адмоўных начных тэмператур месцамі будуць утварацца галалёдныя з'явы.**

У начныя і ранішнія гадзіны будуць згушчацца туманы. У гэтай сувязі кіроўцам і пешаходам трэба быць вельмі пільнымі і асцярожнымі. У далейшым з паступленнем больш халодных паветраных мас тэмпература панізіцца і будзе вагацца ад слабага мінуса да слабага плюса, пры гэтым дзённыя максімумы будуць знаходзіцца ў асноўным у межах дадатных значэнняў, паведамляюць нам спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У аўторак будзе адносна цёпла. У гэты дзень у многіх раёнах краіны пройдуць дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны па захадзе краіны на большай частцы, а на астатняй тэрыторыі месцамі згусціцца туман. Тэмпература паветра ўначы будзе ў межах ад плюс 2 да плюс 8 градусаў, а днём — ад плюс 5 градусаў па паўночным усходзе да 14 цяпла па паўднёвым захадзе краіны. Менавіта з-за туманаў у аўторак абвешчаны аранжавы ўзровень небяспекі.

У сераду ноччу месцамі, ранііцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу, па паўночным усходзе магчымы мокры снег. Ноччу і раніцай у асобных раёнах слабы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад мінус 1 градуса на поўначы да плюс 9 градусаў на паўднёвым захадзе, а ўдзень — ад плюс 3 да 10 цяпла. Па поўдні краіны чакаецца да плюс 12 градусаў.

У чацвер на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца дажджы і мокры снег. Ноччу і раніцай на асобных участках дарог галалёдзіца, па паўднёвым захадзе месцамі згусціцца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 градусаў па поўначы да плюс 8 градусаў па паўднёвым захадзе. Днём будзе плюс 1—8 градусаў, а па поўдні — да 12 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу-суботу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Пераважна па поўначы магчымы слабы галалёд, на асобных участках дарог галалёдзіца, а ў паўднёвых раёнах згусціцца слабы туман. Ноччу слупкі тэрмометра пакажуць ад мінус 3 градусаў па паўночным усходзе да плюс 10 градусаў па паўднёвым захадзе. Днём сіноптыкі абяцаюць ад 0 градусаў у паўночных да плюс 13 градусаў у паўднёва-заходніх раёнах краіны. Вось так. Падобна, другой хвалі бабінага лета мы ўжо не ўбачым.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# «СПЕЦАПЕРАЦЫІ» МАХЛЯРОЎ



## ВЕРЫЛА Ў СПЕЦАПЕРАЦЫЮ

У ходзе следства па гэтай справе стала вядома, што сёлета ў ліпені з гамяльчанкай па тэлефоне звязаліся лжэправаахоўнікі. Злачынцы ўнушылі пенсіянерцы, што яна ўдзельнічае ў спецаперацыі. Падчас афармлення ўжо рэальных крэдытаў на імя жанчыны банкаўскія работнікі папярэджвалі, што яна, магчыма, стала ахвярай махляроў. Жанчына не паслухала і не стала абмяркоўваць ні з кім сваю сітуацыю, бо была перакanана, што напісала па ўказанні «куратара» «падпіску аб неразгалошванні ходу спецаперацыі». Між тым махляры не супакоіліся. Раніцай 27 ліпеня пенсіянерка атрымала па мабільным тэлефоне заданне — падпаліць два аўто, прыпаркаваныя ў розных раёнах Гомеля. Жанчына ўключылася на тэлефоне аднабаковую відэасувязь і пад бесперапынным суправаджэнне «куратара» зрабіла ўсё, што той сказаў. Агульны ўрон уладальнікам падпаленых машын склаў звыш 21 тысячы рублёў. Падчас следства жанчына ўсвядоміла маштаб падману тэлефонных ашуканцаў і абсурднасць сваіх дзеянняў, раскаялася і пакрыла прычыненую шкоду. Тым не менш 61-гадовай гамяльчанцы прад'яўлена абвінавачанне па частцы 2 артыкула 218 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь — наўмыснае знішчэнне, пашкоджанне чужой маёмасці, учыненае агульнанебяспечным спосабам, што прывяло да прычынення ўрону ў буйным памеры.

## КУДЫ ЗНІКЛІ ГРОШЫ ПАСЛЯ СПРОБЫ АПЛАЦІЦЬ «КАМУНАЛКУ»?

— Уражвае ступень нахабства махляроў, якія, можа, думаюць, што застануцца без пакарання і не толькі падманам вымагаюць грошы ў ахвяр, але здзекуюцца, зневажаюць даверлівых людзей і ўцягваюць сваіх ахвяр у злачынную дзейнасць, — звяртае ўвагу **намеснік начальніка ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці крымінальнай міліцыі УУС Гомельскага аблвыканкама Вадзім БОРСУК**.

Як зазначае Вадзім Уладзіміравіч, адным з самых распаўсюджаных відаў махлярства ў рэгіёне па-ранейшаму застаецца так званы вішынг. Гэта перанакіраванне карыстальнікаў на падробленыя інтэрнэт-рэсурсы.

— Як правіла, ашуканцы падрабляюць сайты банкаўскіх устаноў, — кажа Вадзім Борсук. — Кіберашуканцы за кошт раскручанай рэкламы дамагаюцца таго, што іх падроблены сайт падымаецца на першыя пазіцыі ў пошукавых сістэмах. Чалавек, увёўшы ў пошукавіку запыт «інтэрнэт-банкінг», пераходзіць менавіта на першы па выніку пошуку сайт і трапляе ў пастку.

Праваахоўнікі даюць шэраг рэкамендацый, як пазбегнуць такой сітуацыі.

— Падроблены сайт адразу вядзе на поле аўтарызацыі, дзе трэба ўвесці асабістыя даныя — логін і пароль ад вашага інтэрнэт-банкінгу. Перад тым, як уводзіць асабістыя даныя, праверце работу астатніх укладак сайта — кантакты, навіны. На сайце рэальнай банкаўскай установы заўсёды будуць працаваць усе ўкладкі. Калі вы не можаце перайсці на галоўную старонку сайта, дзе пазначана агульная інфармацыя, то 99 % гэта падроблены сайт. Акрамя гэтага, не забываем правяраць правільны адрас у адрасным радку. Не так даўно ўсе банкаўскія арганізацыі масава рассылалі сваім кліентам СМС-паведамленні з карэктным адрасам рэсурсу, прапісваючы кожную літару. Тым людзям, якія не ўпэўненыя, можна звярыцца з гэтай інфармацыяй і літара за літарай у адрасным радку ўвесці правільны адрас сайта. Пасля гэтую старонку перавядзіце ў «закладкі», каб кожны раз не шукаць сайт у пошукавіку і выпадкова не зайсці на падробленую старонку, — тлумачыць намеснік начальніка ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці.

Дарэчы, у верасні за адзін тыдзень на факце крадзяжу грошай з асабістых рахункаў звярнуліся 15 пацярпелых гамяльчан. Усе заяўнікі сталі ахвярамі менавіта вішынг-сайтаў. Большасць хацелі аплаціць камунальныя паслугі праз інтэрнэт-банкінг. Пацярпелыя ўводзілі ў пошукавы радок назву банка, пераходзілі па першай спасылцы, якую выдаў пошукавік, пазначалі логіны і паролі асабістых кабінетаў, пасля чаго сайт выдаваў памылку. Атрымаўшы асабістыя даныя гамяльчан, ашуканцы скралі з рахункаў людзей грошы.

Трапіць на такую хітрасць махляроў могуць і карыстальнікі пляцовак бясплатных аб'яў, звяртаюць увагу праваахоўнікі. Тут не важна, прадаяце вы тавар ці купляеце. Пакупнікоў махляры прыцягваюць, як правіла, нейкім таварам па «гарачай» цане. Ахвяры губляюць пільнасць, бо «прадавец» прыспешвае — у яго ўжо «чарга з пакупнікоў» і прадасць таму, хто першым унясе перадаплату. Пакупнікі вераць і, каб перавесці задатак, пераходзяць па дасланай спасылцы нібыта банкаўскага сайта, уводзяць рэквізіты сваёй банкаўскай карткі...

— Звяртаем увагу, што пры пакупцы або продажы тавараў праз інтэрнэт неабходна карыстацца толькі афіцыйнымі апетарамі, якія ажыццяўляюць дастаўку праз афіцыйныя пункты выдачы. Калі вы жадаеце купіць нешта дарагое, то лепш сустрэцца з прадаўцом і агледзець тавар. Калі патрабуецца ўнясенне задатку, то таксама лепш асабіста перадаць грошы прадаўцу, бо, калі здзелка потым акажацца махлярствам, будзе да каго прад'явіць прэтэнзіі, — заклікае суразмоўца.

## ПАД ЧАРАМІ ХУТКАГА ЗАРОБКУ

Гомельскія праваахоўнікі акцэнтуюць увагу грамадзян на новую схему ашуканцаў — ілжэінвестыцыйныя прапановы. У Гомелі ўжо ёсць пацярпелыя на такіх злачынствах. Нядаўна ў пастку махляроў патрапіла гамяльчанка, якая пазбавілася 70 тысяч рублёў.

Жанчына ўбачыла ў сацыяльнай сетцы рэкламу, якая прапаноўвала зарабіць грошы на інвеставанні ў акцыі афіцыйных дзяржаўных прадпрыемстваў. Цікава, што гамяльчанка сапраўды цікавілася гэтай тэмай. Аналізуючы яе пошукавы запыт, ашуканцы наўмысна дасылалі ёй адрасную рэкламу. Спекулявалі тым, што прадпрыемствы, у акцыі якіх можна ўкласці грошы, добра вядомыя, абяцалі імгненны даход на працэнтах ад укладу — літаральна за некалькі дзён можна прымножыць капітал ледзь не ўдвая. Калі чалавек верыць ашуканцам і ўкладвае грошы ў гэтую піраміду, яго падаграваюць тым, што ў яго «асабістым кабінеце» наглядна відаць, як растуць працэнты па ўкладзе і, адпаведна, грошы на рахунку. Пацярпелая, калі прыйшоў час, захацела вывесці заробленыя працэнты на картку, але «куратары» пераканалі, што неабходна для гэтага аплаціць камісію. Атрымаўшы грошы, спынілі зносіны ў месенджарах і выдалілі сайт.

Праваахоўнікі папярэджваюць, што ні ў якім разе нельга выдаляць перапіску ў месенджарах з адрасатамі па здзелках, пераводзе грошай. Здараецца, людзі, здагадаўшыся, што сталі ахвярай ашуканцаў, выдаляюць спасылку на падроблены рэсурс. Тлумачаць, што баяліся, каб з іх рахункаў не працягвалі здымаць грошы.

## ЛЕДЗЬ НЕ ПАЗБАВІЛАСЯ ЖЫЛЛЯ

На Гомельшчыне цяпер ідзе расследаванне па справе аб махлярстве ў дачыненні да пажылой жанчыны.

— На сувязь з пенсіянеркай па месенджары выйшаў зламыснік, які назваўся палкоўнікам Міністэрства ўнутраных спраў. Ён пераканаў жанчыну, што яна павінна дапамагчы вывесці на чыстую ваду бандытаў. Для гэтага варта скласці дагавор аб продажы кватэры ў рыэлтарскай фірме, каб гэтымі грашыма потым дапамагчы, нібыта, затрымаць злачынцаў. Грамадзянка зрабіла ўсё, як папрасілі ашуканцы. Яна сустрэлася ўжо з пакупнікамі і ўзяла задатак. Але тут нечакана ўмяшаліся рыэлтары. Работнікі фірмы змаглі пераканаць жанчыну, што яна трапіла на кручок ашуканцаў. Угаварылі скасаваць дагавор па продажы кватэры і звярнуцца ў міліцыю. Можна толькі падзякаваць супрацоўнікам агенцтва, якія не захацелі нажывацца на пажылым чалавеку, умяшаліся і парушылі планы махляроў, — адзначае Вадзім Борсук.

Праваахоўнікі звяртаюць увагу, што супрацоўнікі міліцыі не маюць права па службовых пытаннях звязвацца з грамадзянамі ў месенджарах.

— Калі да вас паступіў званок ад невядомага супрацоўніка банка, следчага, праваахоўніка, неабходна спытаць і запісаць яго прозвішча і пасаду. У любым выпадку, можна заўсёды патэлефанаваць па «102» і даведацца, ці працуе такі супрацоўнік, калі гэта рэальны чалавек, вы зможаце прыйсці да яго на прыём. Калі звязваецца супрацоўнік банка, таксама можна зайсці на сайт банка, патэлефанаваць па кантактных нумарах, «гарачай лініі» і праверыць, ці звярнуўся да вас рэальны супрацоўнік, і распавесці аб сітуацыі, — дадае суразмоўца.

## «АЛЁ, МАМА!»

Па-ранейшаму застаюцца актуальнымі выпадкі махлярства па так званай схеме «Алё, мама!». Па тэлефоне звязваецца нібыта ваш знаёмы, родны чалавек і хутка перадае трубку «следчаму», які просіць праз кур'ера перадаць грошы. Так, маўляў, вырашыцца праблема з ДТЗ, у якое зноўтакі нібыта трапіў ваш блізкі.

— Характэрна, што ашуканцы могуць складаць асабісты партрэт будучай ахвяры. Яны маніторацць уліковыя запісы тых жа пажылых грамадзян у сацыяльных сетках. Уліковы запіс, як правіла, адкрыты для ўсіх. Людзі адзначаюць сваіх дзяцей, бацькоў, сваякоў. Пасля махляры тэлефануюць ахвяры ўжо з поўнай інфармацыяй. Яшчэ раз неабходна пазначыць, што ў Рэспубліцы Беларусь ніякія пытанні за грошы не могуць вырашацца, як у крымінальных серыялах, што глядзяць людзі. Калі вам паступіў падобны званок, адразу тэлефануйце чалавеку, на якога спасылаюцца, усім яго сваякам, знаёмым. У любой падобнай сітуацыі, адказвайце: «Мне трэба падумаць». Ёсць правіла 24 гадзін, калі нават моцна ўзрушаны чалавек супакойваецца і можа крытычна ацаніць сітуацыю, — раіць намеснік начальніка ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці.

## «ГЭТА НЕ ТРЫВІЯЛЬНЫЯ ЗЛАЧЫНСТВЫ»

Дарэчы, на Гомельшчыне нядаўна ў вельмі непрыемную сітуацыю трапіла маладая дзяўчына. Ашуканцы па тэлефоне падштурхнулі яе перавесці грошы на рахунак зламысніка. Але на гэтым не спыніліся.

— Пераканалі яе, што нібыта супрацоўніку банка трэба ідэнтыфікаваць дзяўчыну як уладальніцу рахунку, з якога яна перавяла грошы. Зрабіць гэта можна толькі па фота ў голым выглядзе. Дзяўчына паверыла і адправіла сваё фота. Пасля ашуканцы вымагалі ў яе грошы, пагражаючы выкласці здымкі ў інтэрнэт, зганьбіць яе, — прыводзіць адзін з апошніх фактаў злачынства супрацоўнік МУС.

Па словах праваахоўнікаў, як правіла, у адносінах да беларусаў падобныя схемы ажыццяўляюць групы ашуканцаў з-за мяжы. Яны ведаюць, што міжнароднае супрацоўніцтва па раскрыцці такіх злачынстваў патрабуе часу.

— Сёлета супрацоўнікамі галоўнага ўпраўлення супрацьдзеяння кіберзлачыннасці на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі затрыманы грамадзянін, які генерыраваў вішынгавыя спасылкі сайтаў. Дзякуючы таму, што нашы супрацоўнікі старанна дакументавалі адрас створаных ім спасылак, а ў яго быў свой «почырк», нам удалося гэтыя справы аб'яднаць у адну вытворчасць і затрыманаму грамадзяніну выставіць агульную шкоду. Гэта сведчыць аб тым, што вядзецца скрупулёзная праца, якая ў далейшым дасць магчымасць устанавіць ашуканцаў, даказаць факт іх злачынстваў, — рэзюмаваў Вадзім Борсук.

Апошнія два гады праваахоўнікамі былі таксама затрыманы «воркеры» — людзі, якія за грошы ўдзельнічаюць у перапісцы з патэнцыяльнымі ахвярамі, выманьваюць рэквізіты, высылаюць спасылкі на падробленыя сайты. У дадзеным выпадку гэтыя грамадзяне нясуць адказнасць як члены злачыннай транснацыянальнай групы.

Супрацоўнікі міліцыі нагадваюць, што ўзмоцнена адказнасць па асобным складзе 222 артыкула Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь — незаконны абарот сродкаў плацяжу і інструментаў. Так называецца продаж свайго банкаўскага рахунку, прывязанай да яго карткі, якую выкарыстоўваюць зламыснікі ў сваіх схемах. У выпадку паўторнага здзяйснення такога злачынства чалавеку пагражае абмежаванне волі тэрмінам да 10 гадоў.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Трамп назваў Вашынгтон «бруднай пасткай» і самай небяспечнай сталіцай

Такое меркаванне экс-прэзідэнт Злучаных Штатаў Амерыкі выказаў у сваёй сацсетцы Truth Social, паведаміла ТАСС. Як адзначыў былы кіраўнік Белага дома, амерыканская сталіца ператварылася «ў брудную, напоўненую злачыннасцю, смяротную пастку». «На дадзены момант гэта, бадай, самая небяспечная сталіца ў свеце», — заўважыў палітык. Пры гэтым ён паабяцаў «ачысціць, адрамантаваць і аднавіць» горад у выпадку сваёй перамогі на будучых прэзідэнцкіх выбарах. Трамп неадночы крытыкаваў адміністрацыю цяперашняга прэзідэнта ЗША Джо Байдэна за міграцыйную палітыку, у выніку якой, паводле яго слоў, Злучаныя Штаты ператвараюцца «ў звалку». Палітык адзначаў, што амерыканскія гарады «наводнены бяздомнымі, наркаманамі і жорсткімі злачынцамі».

## Правыя кансерватары перамаглі на парламенцкіх выбарах у Швейцарыі

Перамогу атрымала правакансерватыўная Швейцарская народная партыя, паведаміла выданне Swissinfo. «У цяперашніх парламенцкіх выбарах у Швейцарыі ёсць некаторыя ўнікальныя асаблівасці. Швейцарская народная партыя вельмі блізка падабралася да свайго папярэдняга рэкорднага выніку 2015 года, і ўсё дзякуючы стаўцы на адну, але важную тэму — міграцыя», — адзначыла Swissinfo, дадаючы, што сваю ролю маглі адыграць і падзеі на Блізкім Усходзе. Як удакладняе агенцтва Bloomberg, Швейцарская народная партыя таксама імкнецца замацаваць традыцыйны нейтралітэт краіны. «Вынікам гэтых выбараў стане ўзмацненне жорсткасці палітыкі ў галіне міграцыі і выдзялення прытулку», — паабяцаў у інтэрв'ю тэлеканалу SRF лідар фракцыі ШНП у Нацыянальным савеце Томас Эшы.

## Малдаўскія фермеры запатрабавалі ўвесці надзвычайны рэжым у сельскай гаспадарцы

Малдаўскія сельгасвытворцы настойваюць на ўвядзенні рэжыму надзвычайнага становішча ў аграрным сектары з-за праблем з пагашэннем крэдытаў. Аб гэтым заявіў выканаўчы дырэктар Нацыянальнай федэрацыі фермераў Васіль Мірзенка па выніках Рэспубліканскага кангрэса аграрыяў, паведаміла РІА «Новости». «Кожны дзень паступаюць званкі ад фермераў, чыю ўласнасць канфіскавалі банкі, пастаўшчыкі і крэдыторы, іншыя нават губляюць свае дамы. Мы працягваем патрабаваць увядзення надзвычайнага становішча ў сельскагаспадарчым сектары, каб вызваліць фермераў ад адказнасці перад крэдыторамі, адтэрмінаваць тэрміны пагашэння крэдытаў», — сказаў ён. На кангрэс у Кішынёве сабраліся больш за 600 фермераў. Цэнтральнымі тэмамі сталі праблемы, звязаныя з пагашэннем крэдытаў з-за неўраджаю і адсутнасці падтрымкі з боку ўлад. Пры гэтым сельгасвытворцы падкрэслілі, што калі іх скаргі не будуць задаволены ў найбліжэйшыя сем дзён, то яны выйдуць на пратэсты, у тым ліку з сельгастэхнікай.

# ВІРТУАЛЬНЫЯ ТРЭНАЖОРЫ, ЛІЧБАВЫЯ ПРЫЛАДЫ, СМАРТ-ТЭХНАЛОГІІ

## Цікавінкі XXVII Беларускага энергетычнага і экалагічнага форуму Energy Expo

**Інавацыйныя тэхналогіі ў сферы энергетыкі, экалогіі, лічбавізацыі, электратранспарту, энергазберажэння на мерапрыемстве прадставіла больш як 200 айчынных і замежных арганізацый. Тут было ўсё: ад прылад для рэалізацыі смарт-праектаў «разумнага горада» і лічбавых рашэнняў у сферах энергетыкі да электрамабіляў, віртуальных трэнажораў і карцін, напісаных на мармуровай аснове камянямі розных памераў. Эксперты ўпэўнены, што выстава дазваляе аб'ядначаць энергетыкаў, спажыўцоў энергарэсурсаў, эколагаў, ацаніць ужо зробленае і пазнаёміцца з найноўшымі прадуктамі і тэхналогіямі.**




### СІМБІЁЗ ІТ-РАШЭННЯЎ І ЭКАНОМІКІ

Вогнеўстойлівыя кабелі; разумныя сігналізатары загазаванасці і лічыльнікі газу; свяцільнікі, якія самі ўпраўляюць асвятленнем; прадукцыя з металу, надрукаваная на 3D-прынтарах; прадукты для энергазберажэння; прылады для лічбавізацыі... На выставе экспаненты прадставілі шырокі спектр тэхналогій, прылад і праграмных рашэнняў, адзначалі спецыялісты.

*— Час паказвае, што без лічбавых тэхналогій ні ў адной галіне справа не абыходзіцца, і тут важнае разумнае эканамічна абгрунтаванае прымяненне,* — выказаўся **Канстанцін ШУЛЬГАН, міністр сувязі і інфарматызацыі.** *— Найперш, эканоміка, бо за кожнай работай стаяць затраты, якія кладуцца на плечы спажыўца. Каб ён з задавальненнем мог аплачваць паслугі па электрычнасці, яны павінны быць для яго зручнымі і пад'ёмнымі. Сёлетняя выстава парадавала сімбіёзам ІТ-рашэнняў і рэальнага сектара эканомікі і ў галіне энергетыкі. Хацелася б яшчэ, каб час пераходу ад пагадненняў да канкрэтных праектаў быў мінімальны.*

На інтэрактыўным стэндзе Дзяржэнерганагляду, напрыклад, можна было ў віртуальнай прасторы наведаць ванны пакой, дзе на сабе адчуць небяспеку, якая там хаваецца. Напрыклад, калі дакрануцца да электраразеткі мокрымі рукамі. А яшчэ даведацца, што будзе, калі лавіць рыбу пад электрасеткамі.

З дапамогай віртуальных трэнажораў у 3D-рэальнасці наведвальнікі спрабавалі сябе ў якасці зваршчыка ці экскаватаршчыка. Дарэчы, менавіта на такім абсталяванні і навучаюцца гэтым прафесіям. Заснавальнікі абсталявання кажуць, што пасля асваення такіх поўнапамерных прылад чалавек напрацоўвае маторыку рук і навыкаў і можа адразу працаваць з рэальнымі аб'ектамі. А ў Беларуска-Расійскім універсітэце праграмаванню і робататэхніцы студэнтаў у лабараторыях вучаць міні-робаты, якія таксама былі на выставе.

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **д. Осово** | 624881710301000047 | 0,15 га | (1 09 02) земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, права на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) | 6 000.00 |
| 2 | **д. Жажелка, ул. Заречная** | 624881705601000184 | 0,15 га | | 9 000.00 |

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, Смолевичского райисполкома: http://www.smolevichi.gov.by

УНП 600023532

## Ликвидатор ОДО «БИРРУС» (УНП 190068262) в связи с ликвидацией объявляет о проведении 24.11.23 в 14.00 торгов в форме аукциона по адресу: Минск, ул. Л. Беды, 29, помещение 1Н по продаже имущества ОДО «БИРРУС»:

**лот № 1. Объект недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 710/С-8862, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Орловского, д. 25Б, корп. 4 (наименование: склад аммиака, назначение: здание специальное иного назначения),** площадью 69,1 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 741000000007000569.

Начальная стоимость: 5 160,00 руб., в том числе НДС 860,00 руб.

Договор купли-продажи предмета торгов может быть заключен с единственным участником торгов с увеличением стоимости соответствующего лота на 5 %.

Договор купли-продажи предмета торгов заключается в течение 2 дней со дня проведения торгов. Оплата по договору купли-продажи предмета торгов осуществляется в течение 2 дней с момента подписания договора. Предмет торгов по договору купли-продажи предмета торгов передается покупателю в течение 1 дня с момента полной оплаты.

Расходы по регистрационным действиям относятся на покупателя. В случае отсутствия оплаты по договору купли-продажи в течение 2 дней договор купли-продажи считается расторгнутым.

Задаток для участия в торгах составляет 5 % от начальной стоимости.

Задаток перечисляется на р/с ликвидатора: ЗАО «Центр ликвидации предприятий»: р/с BY95PJCB30120157221000000933 в ОАО Приорбанк, УНП 191228804.

Имущество находится в г. Бобруйск.

Вся информация и порядок осмотра согласовываются по телефонам, указанным ниже.

Заявления на участие в торгах направляются по адресу: 220040, Минск, ул. Л. Беды, 29, пом. 1Н или по электронной почте info@likvidator.by в срок до 17.00 22.11.2023 г.

Справки по тел. 8029 763-97-34 (вайбер, телеграм); 8029 117-90-77 (вайбер, телеграм); 8017 326-22-32.

# ЗАСЕКІ СОНЦА



На сезонных кірмашах журавіны прадаюць па 8 рублёў за кілаграм.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Грыбы ў гэтым кастрычніку прыязджаюць на сталічныя рынкі ў асноўным з Віцебскай вобласці.

— Мусіць, у нас на Віцебшчыне самыя грыбныя месцы, — усміхаецца маладзенькая прадаўшчыца.

Дзяўчына родам з Талачынскага раёна, грыбы збірала сама, сама і прадае на Камароўцы.

— Трохлітровае вядро падзялёнак — 15 рублёў. Іх цяпер у лесе няшмат. Лісічкі — за 10 рублёў вядзерца аддам, — прапаноўвае яна свой тавар. — А гэта масля́кі, на смак — як свінінка! 7 рублёў маленькае вядзерца, трохлітровае — 15. Махавічкі маленькія — 5 рублёў кантэйнер. Рыжыкі маладзенькія, адзін у адзін, па 15 за кіло.

Шмат сёлета і апенек.

— Па 4 рублі літр прадаю, вядзерца — 8 рублёў, — кажа прадавец Аксана. Апенькі яна збірала пад Браславам. — Грыбы перабраныя, без ножак. Апенькі павінны быць без ножак, так яны смачнейшыя, калі іх смажыць. Ножкі пры смажанні атрымліваюцца слізкія, не ўсе любяць. Я не люблю абы-як, вось і паперабірала. Бачыце, там — маленькія грыбы, тут — большага памеру. Апенькі позняя, апошняя ўжо. Памылі, пасмажылі і ешце!

На прылаўках для пакупнікоў прадстаўлены дакументы аб бяспецы грыбной прадукцыі — несумненны плюс цывілізаванага гандлю. Грыбы, як вядома, адзін з прадуктаў, які больш за іншыя назапашвае солі цяжкіх металаў і астатнія «шкоднасці», і калі сабраць іх у няправільным месцы — ну вось хоць бы ў лясочку ўздоўж трасы, — замест карысці можна атрымаць сур'ёзныя праблемы са здароўем. Не кажучы ўжо пра тое, што далёка не кожны сучасны чалавек — нават сельскі жыхар — лёгка адрозніць сапраўдныя грыбы ад неядомых ці атрутных. Так што, купляючы грыбочкі дзе-небудзь на трасе, мы спадзяёмся толькі на добрасумленнасць і «грыбную кампетэнцыю» прадаўца. Набыццё грыбоў на буйных рынках у гэтым плане больш бяспечнае. Зрэшты, мы пішам пра гэта кожную восень...

Акрамя свежых грыбоў, у гэтым годзе вялікі выбар іншай грыбной прадукцыі. Попытам карыстаюцца сушаныя баравікі, расказалі прадаўцы. Каштуе мяшочак сушаных белых грыбоў (250-260 г) тыя ж 50 рублёў. Сушаныя чырвонагаловікі таннейшыя: 15-20 рублёў за «гірлянду» (а тры такія грыбныя «гірлянды» — гэта вядро грыбоў, сцвярджаюць прадаўцы). Яшчэ адзін грыбны прадукт — мука з сухіх баравікоў або чырвонагаловікаў. Захоўваецца такая заправа гадамі, галоўнае — змясціць яе ў герметычна закрыты слоік, куды не пранікаюць староннія пахі.

## «ЗА» І «СУПРАЦЬ»

Адзначым, што грыбы — самы неадназначны прадукт з пункту гледжання шкоды і карысці. Многія дыетолагі сцвярджаюць, што карысці ад іх арганізму асаблівай няма. Маўляў, проста смачна. З іншага боку, грыбы вельмі нізкакаларыйныя: свежыя баравікі, напрыклад, гэта ўсяго 22 ккал на 100 г, смажаныя — 26 ккал, марынаваныя — 24 ккал на той жа аб'ём. Пасля сушкі каларыйнасць прадукту чакана ўзрастае — на 100 г сушаных баравікоў прыходзіцца 286 ккал (але для сушаных грыбоў 100 г — гэта шмат, ці наўрад вы з'ясце столькі за адзін раз). Акрамя таго, белыя грыбы ўтрымліваюць вітамін А (у выглядзе караціну), вітаміны $B_1$ і С. А таксама вялікую колькасць вітаміну D — каштоўны для нашых шырот «сонечны» вітамін ёсць ва ўсіх грыбах, але ў элітных белых яго больш за ўсё. Акрамя таго, грыбы — каштоўная крыніца бялку. Праўда, смажаныя/вараныя свежыя (баравікі ў прыватнасці) утрымліваюць хіцін, які ўскладняе працэс засваення бялку страўнікава-кішачным трактам чалавека. Таму, з пункту гледжання правільнага харчавання, баравікі лепш есці сушанымі — у гэтым выпадку бялку з іх засвоіцца каля 70-80 %. Дададзім, што баравікі — магутны антыаксідант, да таго ж утрымліваюць рыбафлавін, які дапамагае росту валасоў і пазногцяў, падтрымлівае шчытападобную залозу. Белыя грыбы таксама стымулююць сакрэцыю стрававальных сокаў і нават, па некаторых даследаваннях, пры рэгулярным уключэнні ў рацыён падаўляюць ракавыя клеткі. А яшчэ змагаюцца з гельмінтозам, што агульнавядома. Гэта ўсё аргументы «за».

Аргументаў «супраць» таксама нямала. Грыбы назапашваюць



Шмат сёлета і апенек.

радыенукліды і солі цяжкіх металаў. Гэта цяжкая ежа (дзецям і пажылым людзям уключаць іх у рацыён непажадана). Грыбы могуць аказацца «ілжэ-» — і тады мала не здасца. І, нарэшце, некаторыя віды грыбоў, якія традыцыйна ўжываюцца ў ежу ў нашай кулінарнай традыцыі, насамрэч належаць толькі да «ўмоўнаядомых»: ласі і іншая лясная жыўнасць могуць хрумкаць іх у сваё задавальненне, а чалавечая стрававальная сістэма да іх перастраўлівання не надта прыстасаваная. Да баравікоў і падасінавікаў, зрэшты, гэта не адносіцца.

## «БАЛОТНЫ ВІНАГРАД»

Журавіны — яшчэ адна беларуская восеньская традыцыя. Але ў гэтым багатым на ўраджай годзе якраз журавін на рынках мала.

— Іх і ў лесе мала, — кажа прадавец Кірыл на сезонным кірмашы каля Лядовага палаца ў Мінску. — Бярыце цяпер, танней не будзе.

Растуць журавіны на балотах і іншых сырых тэрыторыях, дзе дастаткова вільгаці і сонечнага святла для выспявання. Сонечнага святла гэтым летам і восенню было дастаткова, а вільгаці не хапіла — вось журавін і мала. Клімат становіцца гарачэйшым, і традыцыйныя беларускія ягады паступова могуць адсунуцца толькі ў паўночныя рэгіёны Беларусі. На сезонны рынак, дзе мы гутарым пра іх, журавіны «прыехалі» з Глыбокага.

Каштуюць гэтыя ягады ў гэтым годзе нятанна — ад 8-10 рублёў за кіло на сезонных кірмашах да 14 — на звычайных рынках.

— А брусніцы сёлета як наогул наўрад ці знойдзеце, — дадае Кірыл. — Іх у лясах проста няма. З-за спякоты завязь пасохла.

Лясныя ягады сёлета не ўрадзілі. Дробнымі былі і лясныя маліны, і чарніцы, і лясныя суніцы, і было іх мала. Ды і журавіны дробныя, наракае суразмоўца. Зрэшты, «месцы трэба ведаць», дадае ён: маўляў, калі ведаць дзе, можна сабраць вядзерца-другое нават у самы няўрадны год.

Калі аб карысці грыбоў (нават прызнаных кухнямі розных краін свету баравікоў) можна спрачацца, то карысць журавін несумненная. Асабліва ў разгар сезона вірусаў. Збалансаваны склад гэтай унікальнай ягады ставіць яе ў адзін шэраг з цытрусавымі па колькасці вітамінаў (хоць іншасказальна журавіны называюць не «балотны апельсін», а «балотны вінаград»).

Журавіны — прыродны мультывітамінны комплекс, адсюль цудадзейныя ўласцівасці журавінавага морсу пры ВРВІ і грыпе. Спрадвеку людзі цанілі, што журавіны валодаюць гарачкапаніжальным эфектам, здольныя пазбавіць арганізм ад інтаксікацыі (што надзвычай важна пры вірусных захворваннях) і даюць магутны вітамінны (С, К, РР, Е, групы В і г. д.) зарад імунітэту. Акрамя таго, клятчатка стымулюе страваванне, фітанцыды спыняюць развіццё шкодных мікраарганізмаў, арганічныя кіслоты ствараюць аптымальныя ўмовы для работы стрававальнага тракта, а багаты мінеральны склад (кальцый, магній, жалеза, фосфар, цынк, марганец) падтрымліваюць дзейнасць усіх органаў і сістэм. І яшчэ журавіны аднаўляюць водна-шчолачны баланс, што таксама немалаважна.

Праўда, карысная гэтая ягада не ўсім — у наймагутнейшага прыроднага супрацьвіруснага сродку ёсць і супрацьпаказанні (якраз па прычыне яго «магутнасці»): ад індывідуальнай непераноснасці да мочакаменнай хваробы. Не рэкамендуецца ўжываць журавіны ў ежу пры запаленнях у страўнікава-кішачным тракце, печані і жоўцевым пузыры. Але ў большасці выпадкаў без гэтых ягад зімой у нашых шыротах не абысціся, таму каля прылаўкаў з журавінамі заўсёды ёсць пакупнікі.

Не раяць педыятры ўводзіць гэтыя ягады ў рацыён малых да трох гадоў — магчымыя алергіі. А вось школьнікам журавіны неабходныя (як і пенсіянерам) — яны паляпшаюць мазгавую актыўнасць.

— Карысней за ўсё, зразумела, спажываць журавіны сырымі, — дзеліцца пакупнік-пенсіянер. — Мы з жонкай, напрыклад, кожную восень на сняданак ядзім свежыя журавіны з аўсянкай. Для смаку дадаём лыжачку мёду. І гэтай восенню пакуль не хварэем, хоць усе вакол смаркаюцца.

Захоўваюцца свежыя журавіны ў халадзільніку, у шчыльна зачыненым слоіку, каля месяца. Мочаныя журавіны можна захоўваць на працягу дзевяці месяцаў. Гэтыя ягады змяшчаюць прыродныя кансерванты, але чым даўжэй вы іх захоўваеце, тым больш усё ж разбураюцца ў іх вітаміны і іншыя карысныя рэчывы. Жадаеце захаваць журавіны даўжэй — замарозьце іх. Замарожаныя журавіны захоўваюць уласцівасці на ўзроўні свежых ягад на тэрмін да года. А вось сушаныя журавіны, застаючыся такімі ж карыснымі, захоўваюцца цэлыя два гады, калі рассыпаць іх па сухіх палатняных мяшочках і пакласці ў прахалоднае месца, абароненае ад сонечных прамянёў.

Каларыйнасць сушаных журавін у разы ўзрастае, так што скінуць вагу на гэтым карысным ласунку не атрымаецца (як і любімы многімі журавіны ў цукровай пудры — зусім не дыетычны прадукт). У 100 г сушаных журавін змяшчаецца цэлых 300 ккал.

## ЯГАДЫ ЗДАРОЎЯ

Брусніцы мы ўсё ж знайшлі — таксама «родам» з-пад Віцебска. Ягады, зразумела, сёлета вельмі дарагія з прычыны эксклюзіўнасці. Каштуе кіло брусніц у сярэднім 25–30 рублёў. Але купляюць іх усё роўна.

— Я прадаю брусніцы па 25 рублёў за слоік 750 грамаў, — кажа прадавец Ірына Мікалаеўна. — Вядзерца трохлітровае аддам за 75 рублёў. Дорага? Магу крыху саступіць... Але наогул і ў сезон такая цана была. Брусніц сёлета няма. Мы і гэтыя выпадкова сабралі: пайшлі ў журавіны, а знайшлі палянку брусніц... Купляюць брусніцы нашы суайчыннікі ў асноўным з медыцынскімі мэтамі — рыхтуюцца да сезона вірусных захворванняў. У больш «брусні́чныя» гады з гэтых ягад у асноўным вараць морс, калі хтосьці з хатніх застудзіўся. Між тым, кажа суразмоўніца, у кулінарных мэтах брусніцы не менш каштоўныя, чым у медыцынскіх.

— Мы доўга жылі на Поўначы, потым вярнуліся ў Беларусь, — распавядае яна. — Там брусніцы збіраюць вёдрамі, вось наша сям'я і прывыкла да іх. Напрыклад, можна ягады адправіць у блэндар — і мяшаць з мёдам: смачна і больш карысна, чым з цукрам. А можна соус да мяса з брусніц гатаваць. Напрыклад, да адбіўных. Брусніцы, соль і часнок. Усё здрабніць блэндарам або прапусціць праз мясарубку. А можна зварыць брусні́чную падліўку да мяса на павольным агні, з духмянымі траўкамі — проста пальчыкі абліжаце!

Брусніцы валодаюць унікальным хімічным складам — па колькасці вітамінаў (А, В, С, Е, К), мінералаў (у прыватнасці, фолievая кіслата і неабходны сэрцу калій) і антыаксідантаў яны могуць параўнацца хіба што з журавінамі. У складзе брусніц таксама антацыяны, якія ўмацоўваюць імунітэт. Агульнавядома, што, уключыўшы ў рацыён брусніцы, можна эфектыўна змагацца з віруснымі інфекцыямі. А яшчэ ўсяго 100 г гэтых ягад задавальняюць сутачную патрэбу чалавека ў марганцы, які ўмацоўвае косці і падтрымлівае аптымальны ўзровень халестэрыну і інсуліну ў крыві. Зрэшты, нават калі ў вас няма ніякіх праблем са здароўем, спажываць у дзень больш за 150–200 г брусніц урачы не рэкамендуюць. У брусніц, як і ў журавін, дастаткова супрацьпаказанняў: захворванні страўніка і кішэчніка, хваробы нырак, алергія.

Свежыя брусніцы захоўваюцца ў халадзільніку не больш за тыдзень (плюс-мінус два дні). Замарожаныя — год. Каб падоўжыць тэрмін захоўвання, брусніцы можна таксама сушыць — у электрасушыльцы, печы або духоўцы.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ШЧАСЦЕ Ў КУБЕ, ЦІ ЯК ГАДАВАЦЬ ТРАЙНЯТ

**Падчас Тыдня бацькоўскай любові ў Гродне ўшанавалі сем'і з дзецьмі-трайнятамі. Урачыстасць адбылася ў абласным перынатальным цэнтры, дзе сем'і сустрэліся з урачамі, якія прымалі роды. Для гасцей былі падрыхтаваны салодкія падарункі і сувеніры. Прыгожых шкляных буслоў для памятнай падзеі спецыяльна зрабілі на Бярозаўскім шклозаводзе.**

Сустрэча прайшла сардэчна. Яно і зразумела: гаворка ішла пра самае дарагое, што ёсць у сямейным жыцці, — дзяцей. А тут і наогул унікальная сітуацыя — сустрэліся адразу дзевяць сем'яў, дзе нарадзіліся трайняты.

— Шчасця многа не бывае, — лічыць **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК,** — але ў гэтых сем'ях трайное шчасце. Вядома, гэта і вялікая адказнасць, клопаты, і можна ўявіць, з чым сутыкнуліся на першых этапах бацькі. Праходзіць час, і многія цяжкасці адыходзяць, забываюцца. З'яўляецца трайная ўпэўненасць у будучыні, што сям'я і надалей будзе жыць, развівацца, бо ўсе дзеці маюць схільнасць да чаго-небудзь, варта ім дапамагчы. Таму хачу павіншаваць з Тыднем бацькоўскай любові. Я ўпэўнены, што ў гэтых сем'ях усё гэта ёсць.

Самым малым, што прыйшлі на сустрэчу, усяго некалькі месяцаў.



Тры дзяўчынкі сёлета нарадзіліся ў Людмілы Паўловіч. Яна не чакала такога цуду, але расказала, што імёны сваіх дзяўчат убачыла ў сне. І потым ужо ведала, у якім месцы знаходзіцца яе Варвара, Васіліса і Марыя.

А вось Святлану і Віталя Моханяў можна назваць вопытнымі бацькамі: іх дзецям па 16 гадоў. Двое сыноў — Мікалай і Антон — навучэнцы Гродзенскага тэхналагічнага каледжа, дачка Аліна вучыцца ў 11 класе і плануе паступаць у медыцынскі ўніверсітэт. Па словах Святланы, сям'я ў іх дружная, хоць і нямала клопатаў. А некалі была разгублена, калі пачула, што чакае трайнят. Праўда, разгубленасць у хуткім часе змяніла ўпэўненасць, што ўсё будзе добра. Так і адбылося. Пры тым, што дзеці нарадзіліся даволі вялікімі, іх агульная вага склала больш за 10 кілаграмаў. У сям'і з першых дзён адчулі ўсе клопаты сацыяльнай дзяржавы.

— Калі дзеці нарадзіліся, нам адміністрацыя Кастрычніцкага раёна выдзеліла сацыяльную няньку, яна прыходзіла 5 разоў на тыдзень і працавала цэлы дзень — з 9 да 17 гадзін. Гэта доўжылася тры гады. Таксама да трох гадоў мы атрымлівалі бясплатнае харчаванне — малако, ёгурты, мясныя кансервы і іншае. Атрымалі пазачаргова кватэру як шматдзетная сям'я.

У сям'і Святланы і Аляксандра Лукашэвічаў расце трое сыноў. Праўда, пры даследаванні прагназавалі дзвюх дзяўчынак і хлопчыка. Але не гэта здзівіла тады цяжарную жанчыну, а сама колькасць дзетак. Калі ёй сказалі, што тройня — не паверыла, пакуль урач не прапанаваў ёй самой іх палічыць. Цяпер Саша, Максім і Станіслаў вучацца ў трэцім класе, прычым у адным. Праўда, Саша лічыць сябе старэйшым, хоць нарадзіўся на адну хвіліну раней. Наогул, наўрад ці хто можа сказаць, што дзеці нарадзіліся з даволі малой вагой — малодшы Станіслаў важыў усяго 900 грамаў. Некалькі тыдняў хлопчыкі знаходзіліся ў спецыяльных кювезах, потым некалькі месяцаў набіралі вагу пад наглядам урачоў у дзіцячай бальніцы.

Сваімі эмоцыямі падзялілася Вольга Варабей. Яна з мужам Андрэем выхоўвае дваіх хлопчыкаў і дзяўчынку. Дзеці ўжо з ранняга дзяцінства захапляюцца спортам. Сямігадовыя Макар і Мікіта займаюцца футболам, дачка Арына — мастацкай гімнастыкай. Дарэчы, сваё майстэрства юная спартсменка прадэманстравала ўсім прысутным.

У сям'і Вольгі і Міхаіла Можджараў таксама спорт у пашане. Дзеці Анастасія і Цімафей займаюцца каратэ. Дарэчы, нараджэнне тройні для сям'і стала сапраўдным цудам. Адбылося гэта 11 гадоў таму. А паспрыяла яму, можна сказаць, дабрыня. Паколькі ў сям'і доўгі час не было дзяцей, яны ўсынавілі прыёмнага хлопчыка. І ў хуткім часе пасля гэтага ў сям'і нарадзіліся адразу трайняты. Як тут не паверыць у цудадзейную сілу дабрыні. Сям'я быццам атрымала ўзнагароду за тое, што агарнула сваім клопатам чужое дзіця і выхоўвае яго як уласнае. А ў падарунак — яшчэ і свае трайняты.

Са сваім урачом Таццянай Калеснікавай сустрэлася сям'я Азерскіх. Святлана прызналася, што да гэтай пары ў памяці захавалася тая цеплыня, клопат, якія яна сустрэла ў абласным перынатальным цэнтры. Свайму ўрачу яна поўнасцю давярала. І нездарма. Таццяна Калеснікава толькі трайнят за сваё жыцця прыняла больш за дзясятак. У Гродне такіх выпадкаў у яе было тры, у тым ліку і Святлана Азерская.

— Гэта цуд — вынасіць і нарадзіць адразу траіх дзяцей. Мы ведаем свае тройні, кожны такі выпадак для нас — свята, стараемся падтрымаць такія сем'і, падказаць, бо гэта сапраўдны мацярынскі подзвіг. А ўвогуле, цяпер колькасць шматдзетных сем'яў павялічылася, амаль у два разы вырасла колькасць партнёрскіх родаў. А ўсяго за 9 месяцаў у абласным перынатальным цэнтры нарадзілася больш за дзве тысячы дзяцей. Прычым хлопчыкаў нараджаецца больш, чым дзяўчынак, — паведаміла Таццяна Калеснікава.

Усе ўдзельнікі сустрэчы прынялі ўдзел у пасадцы туй на сямейнай алеі і пакінулі ў альбоме свае пажаданні будучым сем'ям з трайнятамі.

**Маргарыта УШКЕВІЧ,**
**фота аўтара.**

---

Прававая гасцёўня

# Завяшчаць маёмасць... кату?

## Нельга, аднак можна скарыстацца спадчынным ускладаннем

*— Я даўно на пенсіі, дзяцей не маю, і адзіны мой сябра і член сям'і — кот Марцін. Мне ўжо 80, а майму гадаванцу толькі нядаўна споўнілася сем. Баюся, што ён застанецца адзін і чужыя людзі выганяць яго з кватэры. Хачу пакінуць яму жыллё і невялікі рахунак у банку, але як зрабіць гэта, каб быць упэўненай, што так і будзе?*

**Маргарыта Васільеўна,**
*г. Драгічын, Брэсцкая вобл.*

У натарыяльнай практыцы нярэдка прыходзіцца сутыкацца з сітуацыямі, калі спадчынадавец хоча пакінуць усё, што мае, сваім чатырохногім сябрам. Для многіх людзей жывёлы, якія дораць ім безумоўную любоў, нярэдка становяцца членамі сям'і. Адны ратуюцца з дапамогай кошачак і сабачак ад адзіноты, другія хочуць пра кагосьці клапаціцца. Здараецца, што гадаванец замяняе чалавеку памерлага сваяка або дзіця, якое вырасла і жыве асобна. З такім стаўленнем да жывёлы нядзіўна, што гаспадары хочуць забяспечыць ім бязбеднае існаванне, заўважыла **Алена ФЕЛЬДШАРАВА, натарыус Мінскай гарадской натарыяльнай акругі,** якая патлумачыла, як у нашай краіне гаспадары пасля сваёй смерці могуць забяспечыць бязбеднае жыццё хатнім гадаванцам:

— Айчыннае заканадаўства не дазваляе ўказваць у тастаменце спадчыннікам жывёлу. Нашы гадаванцы не з'яўляюцца суб'ектамі спадчынных праваадносін. Артыкулам 1042 Грамадзянскага кодэкса вызначаны пералік суб'ектаў, якім можна завяшчаць сваю маёмасць. Гэта фізічныя і юрыдычныя асобы, Рэспубліка Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі. Па сваім прававым статусе жывёлы прыраўноўваюцца да маёмасці, а рэчы атрымаць спадчыну не могуць. Такім чынам, можна завяшчаць самога ката, аднак завяшчаць нешта кату нельга.

У асобных краінах, напрыклад, у Вялікабрытаніі ці Італіі, такая працэдура магчымая, аднак у большасці дзяржаў непасрэдна жывёла выступаць спадчыннікам не можа. Атрыманне спадчыны ажыццяўляецца праз траставыя фонды, а павераным асобам даручаюць клапаціцца пра гадаванцаў.



### Прызначыць выканаўцу і яго кантралёра

Каб забяспечыць бязбеднае існаванне ўлюбёным гадаванцам у Беларусі, іх гаспадары **могуць скарыстацца спадчынным ускладаннем, то-бок абавязаць аднаго ці некалькіх спадчыннікаў утрымліваць жывёлу і належным чынам клапаціцца пра яе і даглядаць.** У гэтым выпадку спадчынадавец павінен завяшчаць частку маёмасці, каб пакрыць расходы на ўтрыманне гадаванца. У тастаменце абавязкова трэба ўказаць не проста, скажам, «паласатая кошка Муська», але і дадаткова ідэнтыфікаваць жывёлу, указаўшы яе пашпартныя даныя або нумар чыпа, каб спадчыннік пасля наўмысна ці выпадкова не «пераблытаў» яе з падобнай іншай кошкай.

Падобнае юрыдычнае рашэнне, аднак, не азначае, што ўсё так і будзе. Выкананне завяшчальнага ўскладання застаецца на сумленні спадчынніка, якому яно адрасавана. Самастойна абараніць свае правы жывёлы не могуць, таму спадчынадаўцу варта прызначыць выканаўцу тастамента (фізічную асобу ці арганізацыю па абароне жывёл), які будзе кантраляваць выкананне волі гаспадара. Пры гэтым згода такой асобы павінна быць указана ёй уласнаручна надпісам на тастаменце або ў заяве, якая прыкладваецца да тастамента.

### Падарыць ці прадаць

Паколькі, згодна з законам, жывёлы ў Беларусі прыраўноўваюцца да маёмасці, то ў дачыненні да іх можна здзяйсняць адпаведныя здзелкі. У артыкуле 137 Грамадзянскага кодэкса сказана, што «Да жывёл прымяняюцца правілы аб маёмасці пастольку, паколькі іншае не вызначана заканадаўствам і не вынікае з асаблівасцяў гэтага аб'екта». Зыходзячы з вышэйсказанага, **сабака, кошка, конь і папугай, як і любая іншая маёмасць, могуць быць прадметам здзелак.** У адносінах да гадаванца можна заключыць дагавор куплі-продажу або дарэння, умовамі якога з'яўляецца падрабязнае апісанне жывёлы, каб пазбегнуць маёмасных спрэчак. Указваюцца колер поўсці, узрост, вага, колер вачэй і іншыя адметныя характарыстыкі знешнасці. Пры заключэнні выплатнага дагавора ўказваецца кошт прадмета здзелкі і парадак аплаты. Уласнікам жывёлы можа быць прадстаўлены пашпарт на гадаванца, сертыфікат аб стане жывёлы, сертыфікат аб прышчэпках, звесткі пра наяўнасць мікрачыпа.

Уладальнік хатняй жывёлы па законе мае права напісаць даверанасць, у якой даручыць свайму прадстаўніку дзеянні ў дачыненні да жывёлы, напрыклад вывезці гадаванца за мяжу. Пры гэтым гаспадару не трэба абавязкова паказваць натарыусу спецыяльныя дакументы ў дачыненні да хатняй жывёлы. Аднак варта памятаць, што законам вызначаны спецыяльныя патрабаванні да рэгістрацыі жывёл ці іх перамяшчэння праз мяжу, дзе можа спатрэбіцца ветэрынарны пашпарт, радаслоўная ці іншы дакумент на жывёлу.

### Асабняк — для кошкі, самалёт — для сабакі

Адным з першых, хто ў XVII стагоддзі вырашыў пакінуць свае збераджэнні на карысць 14 любімых кошак, стаў французскі кардынал Рышэльё. Найбольш улюбёнымі яго гадаванцамі былі чорны кот Люцыфер і белая кошка Мірыям. Калі кардынал хварэў, каты прыходзілі да яго ў ложак і аблягчалі пакуты — Рышэльё на дзіва хутка ачуньваў. Пасля замежных дзяржаў, каб завяваць прыхільнасць кардынала, дарылі яму коцікаў. Так у Францыі з'явіліся персідскія, брытанскія, ангорскія кошкі. Па легендзе, пасля смерці кардынала яго прыбліжаныя не падтрымалі волевыяўленне Рышэльё і знішчылі ўсіх яго гадаванцаў.

У XIX стагоддзі ў імператарскай Расіі ўдача выпала на долю беспароднага сабакі Серкі: багатая купчыха з Вугліча пакінула любімцу вялікую спадчыну ў грашах і нерухомасці. Сваякі спрабавалі аспрэчыць тастамент, аднак прайгралі: пасля смерці сабакі ўсе грошы і маёмасць адышлі гарадской казне.

Грамадзянін Францыі Крыстоф Батар завяшчаў 50 знакамітым катам з Эрмітажа тры тысячы еўра. На гэтыя грошы адміністрацыя музея зрабіла рамонт у падвале, дзе жывуць гэтыя вядомыя жывёлы. Лічыцца, што катоў завезлі ў Эрмітаж па загадзе імператрыцы Лізаветы Пятроўны (Указ «Аб высылцы да двара катоў»), каб ахоўваць ад грызуноў кладоўкі музея, каштоўныя экспанаты і мастацкія палотны. Сёння жывёлы працярнаўна выконваць свае абавязкі, за што знаходзяцца цалкам на дзяржаўным забеспячэнні: катоў кормяць, прышчэплваюць і аказваюць неабходную ветэрынарную дапамогу.

Сучасны рэйтынг самых багатых жывёл свету сведчыць, што на зямлі жывуць чатырохногія ўладальнікі соцень мільёнаў долараў, атрыманых імі ў спадчыну ад гаспадароў. Напрыклад, кошка Шупет мае 200 мільёнаў долараў і жыве ў раскошным асабняку з нянькай. Дызайнер Карл Лагерфельд, які склаў тастамент на карысць Шупет, сцвярджаў, што кошка, якая здымалася ў рэкламных роліках і стала тварам Opel, натхніла куцюр'е на кнігу і модную калекцыю.

Аўчарка Гюнтэр III атрымаў 224 мільёны фунтаў пасля смерці гаспадыні графіні Шарлоты Ліберштайн, а пасля смерці сабакі спадчына перайшла да Гюнтэра IV, які цяпер жыве на віле і падарожнічае па свеце на асабістым самалёце. Яго апекуны ўзважана інвестуюць «сабачы» капітал у нерухомасць і машыны.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## «Группа многоквартирных жилых домов в районе пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко в г. Минске». Жилой дом № 3.1 по генплану. 3-я очередь строительства

**Информация о застройщике:** ОАО «БЕЛАТЭП» (ОАО «БЕЛАТЭП»):
**место нахождения:** 220033, г. Минск, ул. Рыбалко, д. 5, пом. 127.
Режим работы: понедельник — пятница с 9.00 до 17.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни — суббота, воскресенье;
государственная регистрация застройщика: 18.12.1992 г. № 100104554, Мингорисполком (далее – МГИК)

В течение 3 предшествующих лет построены и введены в эксплуатацию следующие объекты: жилой дом № 5 по ул. Рыбалко, фактический срок строительства – 15,5 месяца; жилой дом № 7 по ул. Рыбалко, фактический срок строительства – 14,5 месяца; жилой дом № 9 по ул. Рыбалко, фактический срок строительства – 14,5 месяца; жилой дом № 11 по ул. Рыбалко, фактический срок строительства – 10 месяцев; жилой дом № 25 по ул. Станиславского, фактический срок строительства – 10 месяцев; жилой дом № 27 по ул. Станиславского, фактический срок строительства – 10 месяцев.

**Информация об объекте строительства.**

**Цель строительства:** строительство объекта недвижимости «Группа многоквартирных жилых домов в районе пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко в г. Минске». Жилой дом № 3.1 по генплану. 3-я очередь строительства (далее – жилой дом).

**Этапы и сроки реализации строительства:** начало строительства – 05.06.2023 г., завершение строительства – 04.07.2024 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертное заключение № 232-15/20 от 12.05.2020 г. выдано РУП «Главгосстройэкспертиза».

**Местонахождение строящегося жилого дома:** г. Минск, пересечение улиц Стрелковой и Рыбалко.

**Характеристика строящегося жилого дома:**
19-этажный 133-квартирный жилой дом в конструкциях серии М 111-90. Наружные стены – из сборных трехслойных железобетонных панелей толщиной 300 мм с эффективным утеплителем. Внутренние стены предусмотрены из железобетонных панелей толщиной 160 мм. Высота помещений жилого дома (от пола до потолка) – 2,64 м. Проектом предусмотрены техподполье, теплый технический чердак. Жилой дом оборудован пассажирскими лифтами грузоподъемностью 400 кг и 1000 кг. Все квартиры имеют остекленные лоджии. Окна и элементы остекления лоджий – из профилей ПВХ. Для физически ослабленных лиц предусмотрены подъемники при входах в здание. Система отопления запроектирована с установкой узла учета тепла для каждой квартиры. В проекте предусматриваются индивидуальный учет холодной и горячей воды для каждой квартиры. Предусмотрен расчетный учет электроэнергии: для каждой квартиры – в этажных щитках. Все приборы объединены в систему автоматизированного учета (АСКУЭ).

Наружная отделка: стены – фактурное покрытие защитно-декоративным полимерным составом, окраска фасадной краской. Источник теплоснабжения – наружные тепловые сети. Для телефонизации жилого дома проектом предусмотрен ввод магистрального волоконно-оптического кабеля.

Общее количество квартир – 133, в том числе 1-комнатных квартир – 19, 2-комнатных квартир – 58, 3-комнатных квартир – 56.

**Количество предлагаемых для заключения договоров объектов долевого строительства:** 30 единиц.

**Цены на объекты долевого строительства:**

**1-комнатные квартиры** общей площадью от 44,89 м$^2$ до 45,14 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную от 1300 до 1450 долларов США.

**2-комнатные квартиры** общей площадью от 44,23 м$^2$ до 64,17 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную от 1200 до 1500 долларов США.

**3-комнатные квартиры** общей площадью от 60,06 м$^2$ до 77,60 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную от 1180 до 1350 долларов США.

У застройщика действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа, условий оплаты строящегося жилого помещения и иных факторов, влияющих на стоимость.

**Условия оплаты:** оплата цены объекта долевого строительства (цены договора) производится дольщиком единовременно не позднее 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в МГИК. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному НБ РБ на дату оплаты. Датой оплаты признается дата фактического зачисления денежных средств на счет Застройщика.

При рассрочке (50 % в течение 5 календарных дней после регистрации договора, остаток – по графику платежей) стоимость 1 м$^2$ увеличивается на сумму белорусских рублей, эквивалентную 30 долларам США.

При привлечении кредита по партнерским программам банков стоимость 1 м$^2$ увеличивается на сумму белорусских рублей, эквивалентную 50 долларам США.

**Права застройщика на земельный участок:** свидетельство о государственной регистрации от 03.04.2023 г. № 500/526-15665.

**Элементы благоустройства:** проектом предусмотрены полное благоустройство территории с организацией подъезда, тротуара для пешеходов, пешеходных дорожек. На прилегающей территории запроектированы: площадка для сбора бытовых отходов, места для парковки автомобилей.

**Общее имущество жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию данного дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:**
помещения инженерного назначения, межквартирные, лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного дома.

**Договор строительного подряда** № 3.1/05-2023 от 22.05.2023 г. заключен застройщиком с ОАО «МАПИД».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства:** ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе продаж застройщика, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, 5, пом. 129, **тел.: +375 29 105 71 71** или на сайте **antonovsky.by.**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## «Группа многоквартирных жилых домов в районе пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко в г. Минске». Жилой дом № 3.2 по генплану. 3-я очередь строительства

**Информация о застройщике:** ОАО «БЕЛАТЭП» (ОАО «БЕЛАТЭП»):
**место нахождения:** 220033, г. Минск, ул. Рыбалко, д. 5, пом. 127.
Режим работы: понедельник — пятница с 9.00 до 17.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни — суббота, воскресенье;
государственная регистрация застройщика: 18.12.1992 г. № 100104554, Мингорисполком (далее – МГИК).

В течение 3 предшествующих лет построены и введены в эксплуатацию следующие объекты: жилой дом № 5 по ул. Рыбалко, фактический срок строительства – 15,5 месяца; жилой дом № 7 по ул. Рыбалко, фактический срок строительства – 14,5 месяца; жилой дом № 9 по ул. Рыбалко, фактический срок строительства – 14,5 месяца; жилой дом № 11 по ул. Рыбалко, фактический срок строительства – 10 месяцев; жилой дом № 25 по ул. Станиславского, фактический срок строительства – 10 месяцев; жилой дом № 27 по ул. Станиславского, фактический срок строительства – 10 месяцев.

**Информация об объекте строительства.**

**Цель строительства:** строительство объекта недвижимости «Группа многоквартирных жилых домов в районе пересечения улиц Стрелковой и Рыбалко в г. Минске». Жилой дом № 3.2 по генплану. 3-я очередь строительства (далее – жилой дом).

**Этапы и сроки реализации строительства:** начало строительства – 05.06.2023 г., завершение строительства – 19.08.2024 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертное заключение 15.05.2020 г. за № 209-15/20 выдано РУП «Главгосстройэкспертиза».

**Местонахождение строящегося жилого дома:** г. Минск, пересечение улиц Стрелковой и Рыбалко.

**Характеристика строящегося жилого дома:**
16-этажный 79-квартирный жилой дом в конструкциях серии М464-М-16. Наружные стены – из сборных трехслойных железобетонных панелей толщиной 400 мм с эффективным утеплителем. Внутренние стены предусмотрены из железобетонных панелей толщиной 160 мм. Перегородки – блоки ячеистого бетона (СТБ 1117-98) толщиной 100 мм. В составе стеновых конструкций, разделяющих смежные квартиры, имеются сдвоенные перегородки из ячеистого бетона толщиной 100 мм каждая с заполнением зазора между ними минераловатными плитами толщиной 40 мм с последующим оштукатуриванием толщиной 20 мм. Перекрытия выполняются из железобетонных плит толщиной 160 мм. Высота помещений жилого дома (от пола до потолка) – 2,64 м. Проектом предусмотрены техподполье, теплый технический чердак. Подъезд жилого дома имеет сквозной проход. Жилой дом оборудован пассажирскими лифтами грузоподъемностью 400 кг и 630 кг. Все квартиры имеют остекленные лоджии. Окна и элементы остекления лоджий – из профилей ПВХ. Для физически ослабленных лиц предусмотрены подъемники при входах в здание. Система отопления запроектирована с установкой узла учета тепла для каждой квартиры. В проекте предусматривается индивидуальный учет холодной и горячей воды для каждой квартиры. Предусмотрен расчетный учет электроэнергии: для каждой квартиры – в этажных щитках. Все приборы объединены в систему автоматизированного учета (АСКУЭ). Наружная отделка: стены – фактурное покрытие защитно-декоративным полимерным составом (ЗДПС), окраска фасадной краской. Источник теплоснабжения – наружные тепловые сети. Для телефонизации жилого дома проектом предусмотрен ввод магистрального волоконно-оптического кабеля.

Общее количество квартир – 79, в том числе однокомнатных квартир – 31, двухкомнатных квартир – 17, трехкомнатных квартир – 31.

**Количество предлагаемых для заключения договоров объектов долевого строительства:** 20 единиц.

**Цены на объекты долевого строительства:**

**1-комнатные квартиры** общей площадью от 25,97 м$^2$ до 39,96 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную от 1350 до 1550 долларов США;

**2-комнатные квартиры** общей площадью от 59,81 м$^2$ до 62,9 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную от 1220 до 1320 долларов США;

**3-комнатные квартиры** общей площадью от 75,06 м$^2$ до 75,88 м$^2$. Стоимость строительства 1 м$^2$ квартиры составляет сумму в белорусских рублях, эквивалентную от 1180 до 1300 долларов США.

У застройщика действует система регулирования стоимости в зависимости от площади, этажа, условий оплаты строящегося жилого помещения и иных факторов, влияющих на стоимость.

**Условия оплаты:** оплата цены объекта долевого строительства (цены договора) производится дольщиком единовременно не позднее 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в МГИК. Подлежащая оплате сумма определяется по официальному курсу белорусского рубля к доллару США, установленному НБ РБ на дату оплаты. Датой оплаты признается дата фактического зачисления денежных средств на счет Застройщика.

При привлечении кредита по партнерским программам банков стоимость 1 м$^2$ увеличивается на сумму белорусских рублей, эквивалентную 50 долларам США.

**Права застройщика на земельный участок:** Свидетельство о государственной регистрации от 03.04.2023 г. № 500/526-15665.

**Элементы благоустройства:** проектом предусмотрены полное благоустройство территории с организацией подъезда, тротуара для пешеходов, пешеходных дорожек. На прилегающей территории запроектированы: площадка для сбора бытовых отходов, места для парковки автомобилей.

**Общее имущество жилого дома, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после приемки в эксплуатацию данного дома и передачи объектов долевого строительства дольщикам:**
помещения инженерного назначения, межквартирные, лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного дома.

**Договор строительного подряда** № 3.2/05-2023 от 22.05.2023 г. заключен застройщиком с ОАО «МАПИД».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства:** ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе продаж застройщика, расположенного по адресу: г. Минск, ул. Рыбалко, 5, пом. 129, **тел.: +375 29 105 71 71** или на сайте **antonovsky.by.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «СельэнергоПром»

| Лот | Наименование | Начальная цена без учета НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Автоматическая линия окраски модель SKNG, инв. № 6312** | 1 533,54 | 153,35 | 76,68 |
| 2 | **Автоматическая линия дробеструйной обработки мод MJ, инв. № 6275** | 3 987,21 | 398,72 | 199,36 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 90 %.**
Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 82 (29962) от 02.05.2023, стр. 6, № 106 (29986) от 06.06.2023, стр. 6, № 121 (30001) от 27.06.2023, стр. 4, № 136 (30016) от 18.07.2023, стр. 14, № 150 (30030) от 05.08.2023, стр. 14, № 165 (30045) от 26.08.2023, стр. 6

**Местонахождение:** Минская область, Смолевичский район, деревня Полевая, база ООО «Агрохлеб»

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **10 ноября 2023 года в 14.30 (регистрация с 14.00 до 14.25)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127 |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | С 10.00 24 октября 2023 года до 16.00 8 ноября 2023 года |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «СельэнергоПром», проводимых 10.11.2023.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста по лоту 1 – 7 %, по лоту № 2 – 5 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 5 (пяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи. Покупатель должен принять предмет торгов не позднее 30 (тридцати) календарных дней после оплаты в полном объеме по договору купли-продажи.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Ус Сергей Николаевич, +375293285550.** Дополнительная информация по предмету торгов – **Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «СельэнергоПром» в лице ликвидатора – ООО «С чистого листа», тел. (8-044) 751-38-92 (222201, Минская область, г. Смолевичи, ул. Торговая, д. 20, комн. 1, УНП 691744416)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, ☎ тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

Ликвидатор ОАО «Автометрия» Фотя Д.С.
организует аукцион
**ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ с инвентарным номером 100/D-70910, расположенного по адресу: г. Брест, ул. Брестских дивизий, 3/13, площадью – 778,0 кв. м,** наименование – **нежилое помещение в строении № 13**
(в здании, являющемся недвижимой историко-культурной ценностью, год постройки – конец XIX века), расположенного на земельном участке с кадастровым номером 140100000001007193 площадью 0,1738 га и находящемся в собственности ОАО «Автометрия».

**Торги состоятся 09.11.2023 в 15.00.**

Начальная цена торгов составляет сумму **924 700,00** белорусского рубля. Размер задатка 47 000 белорусских рублей должен быть внесен на следующий расчетный счет продавца: № BY35 PJCB 3012 5039 4910 0000 0933 в ОАО «Приорбанк», г. Брест, BIC: PJCBBY2X не позднее 08.11.2023.

Заявление на участие в торгах и прилагаемые к нему документы принимаются **до 17.00 08.11.2023** по адресу: г. Брест, ул. Брестских дивизий, 3/13. Выигравшим торги признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Величина шага торгов – 5 % (пять) процентов от начальной стоимости лота продаваемого имущества. Победитель аукциона в день его проведения подписывает протокол о результатах аукциона. Договор купли-продажи предметов торгов (лотов) должен быть заключен не позднее 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов.

ОБЪЯВЛЕНИЕ

## ОАО «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ»

**извещает, что внеочередное общее собрание акционеров состоится 3 ноября 2023 года**
по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2. Начало собрания в 10.00.
Регистрация акционеров с 9.30 до 9.55.
При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. О реорганизации открытого акционерного общества «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ» в форме присоединения к нему общества с ограниченной ответственностью «Кухтинское».
2. Об утверждении договора о присоединении общества с ограниченной ответственностью «Кухтинское» к открытому акционерному обществу «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ».
3. О порядке реализации права требования выкупа своих акций акционерами открытого акционерного общества «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ», цене выкупа акций и сроке реализации такого права.

*Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт», тел. 282-57-57.*

УНП 600013173

Перажытае

*Мы працягваем друкаваць успаміны ветэрана айчыннай журналістыкі, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, былога супрацоўніка «Звязды» Міхаіла ШЫМАНСКАГА. Ён — дзіця вайны, узнаўляючы са сваімі бацькамі, іншымі жыхарамі роднай вёскі Пешкі Бярозаўскага раёна многія падзеі, распавядае пра перажытае і незабытае ў час нямецкай акупацыі. Нам усім неабходна берагчы гістарычную памяць, каб не паўтарылася страшнае.*

# У СПАЛЕНЫХ ПЕШКАХ ДАСПЯВАЛІ ЯБЛЫКІ

**Вельмі сумавалі пры нямецкай акупацыі нашы пешкаўцы ад таго, што цяжка было наведваць сваякоў: пасля дзвюх карных аперацый, калі на месцы вёскі засталіся толькі горкія папялішчы. Няшчасныя пагарэльцы жылі на хутарах. Іх было многа ў наваколлі. І дзе прытуліліся твае сваякі — даведацца няпроста. Ну, а калі даведаешся, дык часта сустракацца небяспечна, трэба далёка хадзіць цераз паплавы, лугі, па незнаёмых мясцінах... А гэта рызыкоўна.**

## З ПУСТОЙ ТОРБАЧКАЙ

Не атрымалася ў нас з сястрой Марыяй першая спроба схадзіць летам 1944 года да нашых сваякоў Рэчасаў, якія жылі на хутары вельмі далёка ад Буды. У вёсцы Боркі раптоўна з'явіліся немцы, і мы хутчэй павярнулі назад, паспяшаліся на свой хутар.

У другі раз дабраліся да Рэчасаў. Сястра ўспамінала, што сустрэлі яны нас без асаблівай радасці. Праўда, распыталі, як нам жывецца ў Будзе, паспачувалі, што так бядуем, але хто тады не бедаваў. Мы нават не асмеліліся папрасіць у сваякоў крыху збожжа. Так і засталіся с пустой торбачкай, якую дала нам маці, калі збіраліся да іх.

Вяртацца ў Буду зноў напрасткі нам было нецікава, меркавалі ісці праз Боркі, усё ж такі ў вёсцы весялей. Але перадумалі, бо пешкаўцам было крыўдна ад таго, што нашу вёску карнікі спалілі дашчэнту, а Боркі стаяць сабе, быццам і няма вайны. Па меншай меры, так казалі і дарослыя пешкаўцы, і падлеткі. Словам, не было ў пешкаўцаў да боркаўцаў добразычлівасці, хоць адлегласць паміж гэтымі дзвюма вёскамі — усяго нейкія паўкіламетра грэблі.

## НА СЯДЗІБЕ ВАСІЛЯ ЗЯЛЁНКІ

— Пойдзем цераз паплавы бліжэй да нашых Пешак, — прапанавала сястра. — Хоць здалёку паглядзім на іх, бо зайсці ў вёску нельга, раптам на вуліцы ўсё яшчэ закладзены міны.

— Можна крыху прабрацца і ў саму вёску, — кажу я. — Не на вуліцу, дзе небяспечна, а ў сады. Паглядзім, ці добра спеюць яблыкі. У садах жа не страшна: там ніхто мін не заклаў.

І праз некалькі хвілін мы ўжо на сядзібе Васіля Зялёнкі. Семдзесят восем гадоў мінула з таго часу, але і цяпер — во дзіва! — бачу перад сабой чароўную прыгажосць, у якой мы апынуліся. Уся сядзіба была ў густой зеляніне, расквечанай кветкамі. Вакол — цішыня, спакой, лагода. Цудоўны куточак нашых спаленых Пешак, шчодра сагрэты і абласканы добрым ліпеньскім сонца. Не хацелася тады нам думаць пра вайну — мы былі незвычайна ўражаны і захоплены багатым жывым хараством.

— Глядзі, колькі яблыкаў! — прамовіла сястра. — Вось дык урадзілі.

У канцы агарода, які выходзіў на вясковую вуліцу, расло некалькі яблынь. Іх пасадзіў Васіль Зялёнка. Ён вельмі любіў і ўмеў даглядаць самыя розныя пладовыя дрэвы, кусты, і з тых, што былі пасаджаны калісьці, разрасся амаль сад, які нават закрываў у гэтым месцы агарод.

## ЛЮДЗЯМ НА ЎЦЕХУ

— Яблыкі ўжо пачырванелі, мо паспелі, — кажу я. — Трэба пакаштаваць.

Праз густую траву прабіраемся да яблынь і спыняемся, незвычайна ўражаныя. Адсюль, з паўднёвага боку, галіны дрэў так густа ўсыпаны яблыкамі, што нават ледзь відаць лісце. Да самай зямлі схіліліся галіны пад цяжарам пладоў. Божа, які ж ураджай даспяваў у садзе Васіля Зялёнкі. Ахапіла такая радасць, быццам гэта яблыні на нашай сядзібе, каля нашай хаты. Але ж спалілі праклятыя немцы нашу хату, як і хату Васіля Зялёнкі, як і ўсе нашы Пешкі. І ўсе сядзібы зараслі травой і пустазеллем, адзічэлі. А вось гэты сад — людзям на ўцеху. Акуратна зрываем па яблыку, спрабуем на смак. Кіслыя, хоць мы выбралі чырвоныя.

## ШКАДА, ПАРЭЧКІ АСЫПЛЮЦЦА

— Больш ірваць яблыкаў не будзем, паспрабавалі і хопіць, — кажа сястра. — Хай даспяваюць. А вось парэчкі — глядзі, якія чырвоныя. Значыць, паспелі зусім, іх можна паесці.

На краі агарода разраслося некалькі здаровых кустоў парэчак. Гронкі буйных паспелых ягад вісяць густа-густа. Нікім не кранутыя. Рвём — і ў рот. Ягады кіславатыя, але незвычайна смакавітыя. Адразу праганяюць смагу, ад якой пакутуем пры ліпеньскай спякоце.

— Вось шкада, пераспяваюць парэчкі, — кажа сястра. — Іх трэба хутчэй збіраць, а то асыплюцца на зямлю. Але, відаць, дзядзька Васіль тут не бывае. Мы й не ведаем, дзе цяпер жыве яго сям'я, мо далёка адсюль.

— Пэўна, далёка, бо каб блізка, дык зазіралі б на сваю сядзібу. І парэчкі прападуць, і яблыкі хутка даспеюць — хто іх столькі збярэ. Паведаміць бы як-небудзь дзядзьку Васілю.

— Мы з табой не можам, — уздыхае сястра. — Толькі скажам нашым бацькам, як здарова ўрадзіў сад дзядзькі Васіля, тыя адразу спытаюцца, адкуль мы ведаем. Здагадаюцца, былі ў Пешках. Давядзецца прызнацца, што зайшлі ў вёску, калі вярталіся ад Рэчасаў. Ох, і ўляціць нам ад бацькі.

У нас прападае настрой. Хацелі зрабіць нешта добрае для Васіля Зялёнкі, ды немагчыма. Наеліся спелых парэчак, колькі хацелі, а іх,



здаецца, і не зменшылася, буйныя гронкі так і вабяць вока. Ну як не перажываць, што гэтае дабро не дастанецца людзям. Сялянскія дзеці, мы з маленства прывыклі цаніць кожнае зярнятка ў полі, кожную бульбіну, цыбуліну, агурок і бурачок на агародзе. Кожны яблык, грушу, вішню, сліву ў садзе. Бачылі ж, як цяжка дастаецца гэтае дабро нашым бацькам. А тут яго гіне столькі з-за праклятых немцаў, якія прыйшлі да нас з вайной.

## ПАДПІРАЕМ ДРЭВА

— Глядзі яшчэ на яблыні, і дамоў, — кажа сястра. — З гэтай сядзібы праз паплавы і лугі напрасткі ў Буду. Дабяромся хутка, каб толькі ніякая бяда не страслася, рознае можа быць цяпер, калі ўсюды вайна.

Лепш бы не глядзець на гэтыя яблыні, боль сціскае сэрца. Нам здаецца, што за час, як мы тут, галіны дрэў апусціліся яшчэ ніжэй, яблыні пераплёліся з густой травой і пустазеллем.

— Ох, не вытрымаюць галіны такі ўраджай, — бядуе сястра. — А калі яшчэ наляціць моцны вецер ці разыдзецца навальніца — паламаюцца галіны, і яблыкі не даспеюць, і самі дрэвы пакалечаць. Трэба іх падперці, прычым зараз жа, а то будзе позна. Пашукаем якія-небудзь жэрдкі.

Мы лазім па агародзе. І вось каля тыну ў густой траве знаходзім некалькі жэрдак, іх дзядзька Васіль загадзя склаў тут для патрэбы. Выдзіраем жэрдкі з травы, падпіраем галіны яблынь. Работа вельмі цяжкая і зусім не па сілах нам, галодным і змучаным. Ды яшчэ ў такую спякоту. Але ж мы стараемся. Нарэшце пад усе галіны, якія сагнуліся ад мноства яблык, падстаўлены жэрдкі. Стомленыя і змакрэлыя ад поту садзімся на траву крыху перадыхнуць. Глядзім на яблыні і задаволена гаворым: «Ажно павесялелі яблычкі, быццам адчуваюць, што даспеюць», «Ага, здаецца, усміхаюцца, як людзі, калі бяда іх мінавала».

## НЕЗНАЁМЫ ДЗЯДЗЬКА НАС ПАХВАЛІЎ

Раптам бачым — да нас нехта ідзе. «Хто ж такі? — трывожна здзіўляецца сястра. — Гэта мужчына. А мо дзядзька Васіль, калі так упэўнена кіруе на гэтую сядзібу. Во дык мы папаліся, у чужы сад забраліся».

Незнаёмец ужо зусім блізка, і мы з палёгкай уздыхаем — гэта не дзядзька Васіль. Ён падыходзіць да нас і насцярожана пытаецца: «Вы адкуль, дзеці?» — «З хутара Буды. А гэта наша вёска, спаленая немцамі, прыйшлі паглядзець, што тут». — «І што, без бацькоў? Хто ж вас адных адпусціў?» — падазрона глядзіць на нас незнаёмец.

Мы разумеем, што гэтаму дзядзьку трэба гаварыць праўду. Ён ужо не такі строгі, здаецца, шкадуе нас: «Ах, дзеці, дзеці, там, пэўна, міны закладзены». Адказваем, што пра міны ведаем, таму зайшлі толькі на сядзібу Васіля Зялёнкі, і нікуды больш ні кроку. А тут яблыкаў столькі, аж галлё ломіцца, мы крыху падперлі. Зараз ужо сабраліся на наш хутар, пойдзем напрасткі праз паплавы.

Дзядзька кажа, што ведае многіх пешкаўскіх пагарэльцаў, якія ратуюцца ў Будзе, у тым ліку і нашых бацькоў. Сам ён жыве каля невялічкага паселішча Чарнекава, далёка адсюль. Прыйшоў у Пешкі з надзеяй убачыць сваякоў, але дарэмна. Уся іх сядзіба таксама адзічэла, і няма там ні душы. Нас ён заўважыў нечакана і паспяшаўся сюды, каб мы не ўздумалі выйсці на вуліцу. Пахваліў, што падперлі яблыні, цяжка ўздыхнуў, што ў садзе расце такі багаты ўраджай, а паведаміць пра яго Васілю Зялёнку немагчыма...

На тым мы і развіталіся з дзядзькам. Па дарозе ў Буду яшчэ нарвалі, як нам загадала маці, шчаўя, каб не хадзіць па яго лішні раз. Канешне, сваім бацькам тады не сказалі, што, ідучы ад Рэчасаў, завярнулі ў Пешкі. Можа, потым і прызналіся, цяпер ужо не помню.

## ПАРАДНІЛІСЯ

Забягаючы наперад, скажу: вось як бывае ў нашым жыцці, як Усявышні вызначае людскія лёсы. Праз колькі гадоў дзве сям'і — наша, Шыманскіх, і тых самых Зялёнкаў парадніліся. Мая сястра Марыя выйшла замуж за старэйшага сына Зялёнкаў — Міхаіла. Ён удаўся ў свайго бацьку. Такі ж спакойны, памяркоўны, незвычайна руплівы, ды яшчэ майстар на ўсе рукі: і будаўнік, і цясляр, і сталяр, і адмысловы бондар. Яны доўга жылі ў міры, згодзе і выхавалі дзвюх дастойных дачок: Алена па прафесіі настаўніца, Таццяна — медработнік.

Калі я працаваў у «Звяздзе» і потым, ужо будучы на адказнай пасадзе ўласнага карэспандэнта па Беларусі самай папулярнай саюзнай газеты «Известия», часта прыязджаў у свае родныя Пешкі, дружная сям'я Зялёнкаў жыла ў новай хаце — прыгожай, надзейна пабудаванай, прасторнай. Дзякуй богу, моцна стаіць гэтая хата і цяпер. На самым вясёлым месцы — з краю сядзібы, бліжэй да вясковай вуліцы. І глядзіць на гэтую вуліцу хата шырокімі вокнамі.

Тут я прыпыняюся і ледзь стрымліваю слёзы, хаваю свае вочы ад сястры. Маці заўсёды гаварыла, што я «ўдаўся надзвычай жаласлівы», хвалюючы перажываў за ўсё, што асабліва моцна пацярпела ў вайну. А такое, жудаснае, у спаленых Пешках было паўсюль, у тым ліку на сядзібе маёй сястры Марыі і яе сям'і. Праўда, тыя страшныя сляды нямецкіх злачынстваў паступова сціраліся, раны загойваліся. Але ж памяць назаўсёды засталася ў сэрцах маіх землякоў. Як і ў маім.

Хата сям'і маёй сястры размясцілася на ўчастку, дзе ў вайну раслі тыя самыя яблыні, парэчкі, што так глыбока ўзрушылі нас у далёкі летні дзень, пра які гэты аповед.

## БЫЦЦАМ ДАЛЁКІЯ СЯБРЫ

Не знішчылі іх праклятыя немцы, хоць і спалілі нашу вёску дашчэнту. Дрэвы ж на сваёй зямлі, як і нашы пешкаўцы, разам з людзьмі прайшлі праз страшныя выпрабаванні і пакуты, выжылі гэтыя тры яблыні і некалькі кустоў парэчак. На іх цяпер гляджу замілавана, быццам на старых добрых сяброў. Дык яны і ёсць сябры з цяжкага ваеннага маленства — майго, сястры, усіх падлеткаў нашых спаленых Пешак. Але ж сёння тут ужо цэлы сад: не толькі яблыні і парэчкі, але і грушы, слівы, вішні. Гэта дзядзька Васіль пасля вайны развёў такі прыгожы сад, нават частку агарода забраў. Я і цяпер памятаю, як дзесьці даставаў ён саджанцы, акуратна нёс дамоў, беражліва і старанна высаджваў на агародзе. У той час саджанцы былі ў такой цане, што дастаць іх — найскладанейшая праблема. Кожны вясковец неймаверна стараўся хутчэй пасадзіць свой сад, каб і сядзіба папрыгажэла, і сляды вайны зніклі, і было яблыкаў ці груш, парэчак дзецям на радасць, дый на зіму сушылі.

Гляджу зараз на гэты вясёлы сад і радуюся. Сястра добра разумее мой стан і мае пачуцці:

— Што, браток, успомніў, як мы аднойчы тут падпіралі яблыні, каб іх не паламаў вецер?

— Ага, і тады яблыні быццам усміхаліся нам. Як і цяпер...

**Міхаіл ШЫМАНСКІ.**

Нястрачанае

# ТАЯМНІЦЫ НАМІТКІ І АНДАРАКА

## На выставе ў мастацкім музеі здзіўляюць народнымі касцюмамі

**Спазнаць культурны код народа можна праз многае: мову, нацыянальную кухню, а яшчэ праз адзенне. Магчымасць пазнаёміцца панарамна, але і дастаткова глыбока з беларускімі нацыянальнымі строямі дае выстаўка «Анталогія прыгажосці. Традыцыйны беларускі касцюм», якая цяпер праходзіць у Нацыянальным мастацкім музеі.**



### КАЛЕКЦЫЯ ПАЧАЛАСЯ З БАЛЕТА

Выставачны праект, які прадстаўлены ў дзвюх залах новага корпуса музея, знаёміць наведвальнікаў з асаблівасцямі народнага касцюма шасці этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі і паралельна наглядна дэманструе, як даследавалася дадзеная тэма ў розных кантэкстах. Напрыклад, у нашай краіне захавалася 50 відаў апранання наміткі — галаўны ўбор замужняй жанчыны. Дзякуючы даследчыцкай дзейнасці беларускіх вучоных каля 30 спосабаў гэтага майстэрства ўдалося аднавіць. Напрыклад, вядомы этнограф Марыя Віннікава ўсё жыццё даследуе тэму нашэння беларускіх галаўных убораў.

Ёсць цікавае апавяданне «Як сарочка ў полі вырасла» Канстанціна Ушынскага, дзе пакрокава паказваецца, які шлях праходзіць лён, перш чым ператварыцца ў адрэзак тканіны, што пазней ператворыцца ў адзенне. Згадала яго куратар праекта на пачатку экскурсіі невыпадкова, бо менавіта льняную тканіну нашы продкі выкарыстоўвалі для пашыву касцюма. На выставе мы бачым ужо вынік ва ўсёй яго разнастайнасці. Увогуле, калекцыя беларускай традыцыйнай культуры ў Нацыянальным мастацкім музеі ў свой час пачала фарміравацца, калі сюды пасля вайны з Вялікага тэатра перадалі беларускае адзенне, якое выкарыстоўвалі ў балетных пастаноўках. Але працяглы час з-за недахопу плошчаў экспанаты чакалі сустрэчы з наведвальнікамі музея ў фондасховішчах. Сёння калекцыя мае каля трох тысяч адзінак захоўвання, з якіх каля тысячы — якраз адзенне.



— Улічваючы нашы магчымасці, першапачаткова было некалькі варыянтаў, як прадставіць гэты праект. Адзін — зрабіць акцэнт на калекцыі музея. Іншы — паказаць усё самае лепшае, а гэта найперш Заходняе Палессе. Але тады такі падыход не дазволіць распавесці наведвальнікам, асабліва дзецям, пра іншыя рэгіёны, якія маюць свае адметнасці, — дзеліцца **навуковы супрацоўнік навукова-фондавай работы Нацыянальнага мастацкага музея Вікторыя ПРАКОШЫНА**. — Калі я толькі прыйшла працаваць з калекцыяй традыцыйнай культуры, зразумела, наколькі гэта ўнікальная, шматгранная і гарманічная з'ява. Вядома, не ўсё захавалася ў сілу розных прычын, таму мы вырашылі прапанаваць далучыцца да нашага праекта калегам з іншых музейных устаноў. І атрымалася сабраць цэльныя комплексы.

Экспануюцца не толькі творы традыцыйнага беларускага ткацтва з калекцыі дэкаратыўна-прыкладнога народнага мастацтва, але таксама і беларуская арыгінальная і тыражная графіка, беларускі жывапіс са збору Нацыянальнага мастацкага музея. Тут можна знайсці ўнікальныя экспанаты з фондаў Музея старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра рамёстваў, Сенненскага Дома рамёстваў, Гарадоцкага Дома рамёстваў і фальклору, Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны, Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея.

### ЛЁН І ПАЎЛІНЫ

Старт экспазіцыі дае дэманстрацыя якраз тых прылад, якімі апрацоўвалі лён. Грэбні, трапалы, мялкі і іншае. Сучасным людзям складана, можа, і ўявіць, якім працаёмкім і доўгім быў працэс. Ад зярнятка, якое селянін апускаў у зямлю, да гатовага палатна, што пасля ператваралася ў сапраўдны твор мастацтва. Вельмі адметна і тое, што на выстаўцы прадстаўлены не проста беларускія народныя касцюмы, а напрыклад, экспедыцыйныя фатаграфіі Міхаіла Раманюка, з якога пачалося некалі сістэматычнае даследаванне беларускага касцюма. Іх для праекта даў яго сын. Эмацыянальныя фотакадры тут не проста маўклівыя сведкі часу, а своеасаблівы жывы ўспамін пра ўсіх, хто ствараў адзенне, хто насіў яго і пражываў у ім свае як будзённыя, так і непаўторныя дні.

Цяпер давайце пройдземся пункцірна па экспазіцыі, каб адчуць ва ўсёй паўнаце яе каларыт, паслухаць аповеды пра мінулае, бо адзенне пра многае можа распавесці...

— Вось Заходняе Палессе, Кобрынскі строй, які вылучаецца цэльнасцю мастацка-пластычнага вобраза. Веліч святочнага строю замужняй жанчыны шмат у чым дасягаецца спосабам нашэння галаўнога ўбору — хусты, якая ўяўляе сабой доўгі адрэз тонкага палатна. Ён прыгожа драпіруецца вакол галавы і пакрывае спіну, надаючы пастаці абцякальны сілуэт з мяккімі струменістымі складкамі доўгай полкі, што спускаецца ззаду. Касцюм адрозніваецца віртуознай распрацоўкай паласатага і геаметрычнага арнаменты, які ўпрыгожвае ўсе яго кампаненты. Гэты строй прадстаўлены ў зборы некалькімі суцэльнымі комплексамі, што на сёння з'яўляецца дастаткова вялікай рэдкасцю, — распавядае Вікторыя Пракошына.

Апярэджваючы пытанне прысутных пра пяро паўліна, якое нельга не заўважыць у галаўным уборы, спецыяліст тлумачыць, што яно там невыпадкова. Аказваецца, у тыя часы ў шляхецкіх маёнтках трымалі паўлінаў. Яны лічыліся сімвалам шчасця, людзі таксама верылі ў іх абярэгавую ўласцівасць. Так пёры гэтых птушак знайшлі прымяненне і ў народных касцюмах.

І калі разглядаеш касцюмы дэталёва, то ў кожным уражвае і майстэрства рук, якія іх стварылі, і вынаходніцтва дзяўчат, жанчын, бо кожная імкнулася не проста выглядаць прыгожа, а адпавядаць модзе, самавыяўляцца. Увогуле, традыцыйны касцюм — гэта вобраз, па якім можна не толькі счытваць культурны код беларусаў, — раней яны самі па вопратцы вызначалі сваіх і чужых. Нават у суседніх вёсках існавалі розныя варыяцыі касцюмаў па каларыце, арнаменце, сілуэце.

— Асаблівай тонкасцю і беллю кужэльнага палатна, прастатой геаметрычных арнаментальных матываў вылучаецца Мотальскі строй Іванаўскага раёна, — працягвае аповед куратар праекта. — Філіграннай тэхніка зборак палатна каля каўняра і ў ніжняй частцы рукавоў, а таксама дэкаратыўныя злучальныя швы, выкананыя ніткамі чорнага колеру, падкрэсліваюць канструктыўныя асаблівасці мужчынскіх і жаночых сарочак і з'яўляюцца іх характэрнай рысай. Калі ж звярнуць увагу, напрыклад, на Маларыцкі строй, то там ужо будзе лаканічны сілуэт, багацце дэкору. Жаночы касцюм упрыгожвалі тканым і вышытым арнаментам. Адмысловую ўрачыстасць і манументальнасць строю надаваў галаўны ўбор замужняй жанчыны — хуста, якая ўпрыгожвалася з трох бакоў шырокімі бардзюрамі ромба-геаметрычнага арнаменту, выкананага ў старажытнай тэхніцы вышыўкі наборам, па-мясцоваму — «нацягам». Часам у левым пярэднім рагу хусты змяшчалі асобна вышытую разетку ў выглядзе зоркі. Такія ж разеткі вышываліся на ўнутраным баку правага рукава жаночай сарочкі. Яны з'яўляліся знакамі-абярэгамі для маладой жанчыны, якая чакае дзіця.

### ПАВІВАЛЫ, АНДАРАКІ, КАПТУРЫ

Цікава і тое, што даўней асобныя прадметы касцюма былі абавязковымі атрыбутамі сямейных абрадаў. У мастацкім музеі захоўваецца, напрыклад, вельмі тонкая і доўгая намітка — павівала, якая некалі мела сакральную функцыю на вяселлі. Акрамя навівання на галаву нявесты, ёю звязвалі маладых, і тое сімвалізавала іх аб'яднанне ў сям'ю. Увогуле, у вясельныя касцюмы дзяўчаты некалі ўкладалі ўсё сваё майстэрства. Так, па тым, як вышытая кашуля жаніха, рабілі выснову аб нявесце, яе працавітасці і талентах. Арнаменты на касцюмах маладых пераклікаліся. А галаву нявесце ўпрыгожвалі вянком, які выраблялі з таго, што мелі пад рукой і на што хапала фантазіі.

Ва Усходнім Палессі таксама можна назіраць самыя разнастайныя варыянты традыцыйных строяў, якія звяртаюць на сябе ўвагу мастацка-дэкаратыўным аздабленнем. У XX стагоддзі, калі тут пачалі шырока выкарыстоўваць тканіны фабрычнай вытворчасці, трансфармацыя адбылася і ў касцюме. Але ўсё ж народныя майстрыхі імкнуліся па-ранейшаму спалучаць навацыі і традыцыі, каб адлюстроўваць у іх час і месца стварэння.

Жаночы касцюм Лельчыцкага раёна, датаваны 1950-мі гадамі, вельмі добра дэманструе змены ў народным адзенні Усходняга Палесся. У спустошанай вайной краіне адначасова вытворчасць. У продаж паступала тканіна, каляровыя ніткі, што дало дадатковую прастору для творчасці беларусак пры вырабе касцюмаў. Абавязкова жанчыны хадзілі ў каптурах, паколькі валасы лічыліся нечым сакральным, іх усялях аберагалі.

Падняпроўе — па-свойму ўнікальны этнаграфічны рэгіён, што абумоўлена ў тым ліку і блізкім знаходжаннем яго да некаторых абласцей Расіі і Украіны. Асабліва гэта выявілася ў жаночым касцюме, у якім у пачатку XX стагоддзя існавалі розныя комплексы, што адрозніваліся ў асноўным відамі паяснога адзення: з андаракам, са спадніцай-андаракам, з андаракам, пашытым з безрукаўкай. У галаўных уборах тут пераважаюць хусткі.

На выставе таксама можна ўбачыць і вытрымкі з альбома «Беларускі арнамент Палесся» 1957 года Леаніда Баразны. Яго даследчык ствараў, калі ездзіў у экспедыцыі, і фіксаваў свае знаходкі з першых вуснаў на паперы-міліметроўцы. Сёння тое вельмі дапамагае вучоным і музейшчыкам у працы па рэканструкцыі касцюмаў мінулага. Побач у экспазіцыі размешчаны аўтэнтычныя набоечныя дошкі, узоры тканін, з якіх шылі андаракі. А калі крыху памяняць курс, то заўважыце вопратку з зімніх строяў. Вось зімовыя паліто, у якіх прыходзілі калядаваць, прычым адразу можна прасачыць, як мяняўся крой ад класічных мадэляў да мадэрновых куртак.

— У рэгіёне Падзвіння з прычыны гістарычных падзей, геаграфічных і сацыяльна-эканамічных фактараў у меншай ступені захаваліся традыцыйныя формы адзення. Інтэнсіўнае развіццё ў гэтым рэгіёне таварна-грашовых адносін з канца XIX стагоддзя спрыяла пранікненню ў сялянскае асяроддзе тканін фабрычнай вытворчасці і распаўсюджванню новых варыянтаў крою і дэкаратыўнага афармлення касцюма. Прадметы жаночага адзення хатняга вырабу сведчаць аб высокай культуры ручнога ткацтва і вышыўкі, своеасаблівасці дэкору і каларыту паяснога адзення, — тлумачыць Вікторыя Пракошына. — Таксама рана выйшаў з ужытку і традыцыйны касцюм жыхароў Панямоння. Асаблівасць касцюма гэтага рэгіёна характарызуецца выцягнутым сілуэтам, які задаецца падоўжаным андаракам і фартухом...

І ў завяршэнне хочацца спыніцца на рэгіёне Цэнтральнай Беларусі. Традыцыйны касцюм гэтай мясцовасці ў музеі прадстаўлены асобнымі разрозненымі прадметамі. І па тых звестках, якія здабыты вучонымі, можна меркаваць, што, напрыклад, на тэрыторыі Клецкага раёна Мінскай вобласці ў касцюме былі сарочка з адкладным каўняром, папярочна-паласаты андарак запрасаваны ў дробныя складкі, фартух, безрукаўка і галаўны ўбор з каптура і наміткі.

Выстава працуе да снежня. Тут не толькі знаёмішся з народным касцюмам, а вельмі многае па-іншаму пачынаеш бачыць, той жа вобраз беларускай жанчыны. Альбо, калі знаёмішся з сімваламі на арнаментах, то не толькі заўважаеш там майстэрства, а разумееш, якой моцнай была вера чалавека ў тое, што толькі неба ад усяго магло яго абараніць, даць сілы на стварэнне новага. І галоўная каштоўнасць гэтых экспанатаў — ва ўсведамленні сваіх вытокаў.

**Алена ДРАПКО.**

**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

Вогненныя вёскі. Нельга забыць

# ГОЛАС БЕРАЗЯНКІ




**Памяць пра спаленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны вёскі і іх жыхароў — тэма болю і перажыванняў пра драматычны лёс Беларусі ў сэрцах ужо не аднаго пакалення грамадзян нашай краіны. І не дзіўна, што поруч са святой назвай Хатыні мы ведаем і памятаем пра вогненныя вёскі Дальва, Ала, Прыстань, Боркі...**

**На Пухавіччыне трымаюць у свядомасці лёс Беразянкі. Адрас гэтай цяпер ужо толькі мясціны (хаця былі пасля вайны спробы ўзнавіць паселішча, надаць яму жыццё) — Пухавіцкі сельсавет, непадалёку ад Зацітавай Слабады...**

Дакументальна выверaную, напоўненую архіўнымі і жывымі сведчаннямі памяці біяграфію паселішча і яго трагічнага лёсу ўзнавілі нераўнадушныя даследчыкі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — член Саюза пісьменнікаў Беларусі, падпалкоўнік запасу Аляксандр Плавінскі і палкоўнік запасу Андрэй Шавель. Кніга так і называецца — «Беразянка». Выданне пабачыла свет невялікім накладам у мінскім выдавецтве «Ковчег».

На самым пачатку свайго расповеду аўтары згадваюць пра тое, што іх падштурхнула да стварэння кнігі, якім быў пачатак даследчыцкай дарогі ў паўтара дзесяцігоддзя. Першаштуршок — у нераўнадушных журналісцкіх памкненнях дачкі Андрэя Леанідавіча Дар'і Шавель, якая праходзіла практыку ў раённай газеце «Пухавіцкія навіны», калі вучылася на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Згадваецца і публікацыя Дар'і — «Восставшие из пепла», якую маладая журналістка змясціла ў чэрвені 2015 года ў «Белорусской военной газете». Сваю падтрымку даследчыкам аказалі дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея Тацяна Прысяжнюк і навуковы супрацоўнік музея Юлія Гулецкая. Сваімі знаходкамі падзялілася і галоўны рэдактар газеты «Пухавіцкія навіны» Наталля Пархомчык. Сабраныя дакументальныя матэрыялы пра Беразянку і фотаздымкі пасляваеннага часу аўтарам перадавалі і дзеці і ўнукі людзей, якія перажылі трагедыю спаленай вёскі. Чытаем у кароткай прадмове «Ад аўтараў»: «*...У першую чаргу трэба адзначыць неацэнны ўклад жыхара Беразянкі Пятра Аляксеевіча Скарабагатага, які не толькі захаваў успаміны маці, але і шмат гадоў прысвяціў вывучэнню гісторыі роднага краю. Дар'я Шавель запісала аповед Алены Міхайлаўны Верамейчык (Скарабагатай) і зрабіла копіі фотаздымкаў з яе сямейнага архіва. Запісалі ўспаміны Вольгі Леанідаўны Мігуцкай (Шчэрбы) яе ўнучка Алеся Мікалаеўна Міраненка і праўнук Іван Аляксандравіч Міраненка. Шмат надыктаваў успамінаў на дыктафон Мікалай Леанідавіч Шчэрба да таго, пакуль цяжкая хвароба не падарвала яго здароўе. На жаль, ён не дажыў да нашых дзён і памёр 23 снежня 2022 года». І далей: «Багаты архіў фотаздымкаў захаваўся ў Алы Віктараўны Майко. Найболей каштоўным з'яўляецца даваенны сямейны фотаздымак Кузьмы Назаравіча Майко. На ім мы бачым яго жонку Агрыпіну, якая згарэла зажыва ў стайні, і іх нявестку Ганну Іванаўну, якая прыняла пакутніцкую смерць у полымі. Шмат расказала пра бацьку, Уладзіміра Паўлавіча Сухаверхава, і прадставіла электронныя копіі фотаздымкаў яго дачка Наталля Уладзіміраўна Сухаверхава...*»

Драбнічка да драбнічкі збіралі даследчыкі факты, якія праліваюць святло на трагедыю, паказваюць яе прычыны, адлюстроўваюць характар зверстваў фашысцкіх акупантаў і іх памагатых.

Што ж здарылася ў Беразянцы вераснёўскай раніцай 1943 года?.. Мясцовыя жыхары невялікага паселішча актыўна дапамагалі партызанам. Каля двух дзясяткаў жыхароў паселішча ўліліся ў шэрагі народных мсціўцаў. Беразянкаўцы ўсяляк падтрымлівалі партызан, перадавалі ў лес прадукты харчавання, аказвалі падтрымку ў пераправах праз раку Свіслач, напярэдадні пра набліжэнне немцаў і іх засады, збіралі для партызан звесткі пра дзеянні акупантаў у гарнізонах у Тальцы, Мар'інай Горцы, Блужы і Пухавічах... Выканаўшы баявое заданне, трое партызан вярталіся ў брыгаду «Полымя», размешчаную за ракой Свіслач. Па дарозе Аляксей Шчэрба зайшоў да жонкі — Алесі Шчэрбы. Далей дадзім слова сведку — Віктару Майко: «*У нядзелю 5 верасня 1943 года група партызан спынілася ў Аляксандры Рыгораўны Шчэрба. У гэты час у 11 гадзін дня да вёскі на веласіпедах пад'ехалі немцы. Яны спынілі некалькі вясковых хлопцаў — Віктара Майко, Віктара Ількевіча і Леаніда Шчэрбу, якія не паспелі схавацца, і пачалі распытваць, ці ёсць у Беразянцы партызаны. Затрыманыя, каб спыніць немцаў, сталі даваць блытаныя адказы. Партызаны, якія ўбачылі немцаў, што затрымаліся каля вёскі, выскачылі праз дзверы з хаты. Немцы адкрылі агонь, але партызанам удалося ўцячы. У гэты час падлеткі разбегліся».*

Немцы пайшлі па хатах. Забіралі прадукты і вопратку. У хаце Шчэрбы адзін з немцаў знайшоў пінжак-ватнік, які забыўся партызан, і абойму патронаў ад нямецкай вінтоўкі. Карнікі забралі з сабою гаспадыню Алесю Шчэрбу. Непадалёку ад Блужы, на Майскім раз'ездзе, яе расстралялі. Згодна з расповедам Пятра Скарабагатага, гэта падзея адбывалася ўсё ж 4 верасня... Заслуга аўтараў кнігі яшчэ і ў тым, што яны даюць слова памяці цэлага шэрагу сведкаў альбо падаюць тое, што пераказваюць іх блізкія... Гэта дапамагае праліць болей дакладнае, аб'ектыўнае святло на падзеі даўно забытых дзён.



**Даваенны сямейны фотаздымак Кузьмы Назаравіча Майко. На ім мы бачым яго жонку Агрыпіну, якая згарэла зажыва ў стайні, і іх нявестку Ганну Іванаўну, якая прыняла пакутніцкую смерць у полымі.**

Асобны раздзел кнігі так і называецца: «Беразянка, 6 верасня 1943 года». Менавіта ў гэты дзень адбылася страшная трагедыя. Нягледзячы на папярэджанне партызан, што добрам нядзельная гісторыя не завершыцца, мала хто з жыхароў пакінуў родную вёску... Меркавалі болей грунтоўна падрыхтавацца да жыцця ў лесе. І не паспелі...

22 верасня 1944 года ўпаўнаважаны Пухавіцкага раённага аддзела НКУС Іван Крывашэеў запісаў сведчанні калгасніц «Пуцілаўца», якія на той час жылі ў Зацітавай Слабадзе. Расказвае Марыя Якаўлеўна Карлюкевіч (дата нараджэння — 15 верасня 1900 года): « *... на нашу вёску Беразянка напаў атрад карнікаў з раз'езда Блужа. Прыехалі яны на світанні. Дачка мая 18 гадоў, як і іншыя маладыя дзяўчаты, дома ніколі не начавала. Яны баяліся нечаканай начной аблавы для адпраўкі ў Германію, таму і начавалі ў лесе. Дома я была адна. Убачыўшы праз акно немцаў, я хутка пачала апранацца. Праз некалькі хвілін забягаюць двое — з чарапамі чорнымі на шапках і адразу пачалі шнырыць па хаце. Адкрылі шафу, пачалі забіраць вопратку. Адчынілі куфар — хапаюць бялізну, палатно, што пад руку патрапіць. Пачалі мяне з хаты выштурхоўваць. А на двары, я бачу, — ужо карову з хлева выводзіць немец.*

*Пагналі мяне з астатнімі маімі суседзямі да амбара. Паставілі каля нас варту. А астатнія немцы — чалавек 40-50 — з хат маёмасць выносяць, кароў выганяюць, курэй страляюць. Тут, на месцы, спехам, і ядуць іх. Кішэні ва ўсіх туга набіты. А ў некаторых прама з-за пазухі хусткі жаночыя шарсцяныя тырчаць. Аглядзелі яны наш амбар і пагналі нас да былой стайні — вялікага калгаснага будынка, у якім захоўваўся ўвесь наш ураджай. Адбілі замок, загналі нас усіх туды.*

*Было нас 60 чалавек. Некалькі хвілін мы чулі толькі адзінкавыя стрэлы. Праз шчыліну бачылі, як падбягаюць немцы і падпальваюць будынак. Пасля наша стайня пачала напаўняцца дымам. І мы ўбачылі, што загарэлася салома з абодвух бакоў. Я з іншымі людзьмі, якія стаялі каля варот, кінуліся ламаць засовы. Пад націскам людзей вароты адчыніліся, і мы выскачылі ў двор. Але па нас пачаў страляць кулямёт, некалькі чалавек паваліліся, астатнія кінуліся назад у хлеў. Дзверы за намі зачыніліся. Тады я кінулася да акна. Бачу, жанчыны, якія ў стане былі трымацца на нагах, выкідваюць у акно дзяцей і лезуць самі. Сукенка на мне пачала гарэць. Вочы раз'ядае дым. Сабраўшы апошнія сілы, я таксама выскачыла ў акно. Я не адчувала болю ад ран на руках і нагах, не чула ніводнага стрэлу, крыкаў, бегла, колькі сілы хапала. Прыйшла ў сябе на балоце. Вакол стаяла цішыня. Я з цяжкасцю дабралася да Беразянкі. Прыйшла да таго часу, калі партызаны і тыя, хто застаўся жывымі, капалі магілу для 37 чалавек, якія загінулі ў той дзень. Вечарам усе ацалелыя жыхары Беразянкі пайшлі за партызанамі за рэчку, у лес».*

Аўтары кнігі прыводзяць і іншыя дакументальныя сведчанні, падрабязна расказваюць пра тое, як была ўспрынята трагедыя ў партызанскім злучэнні, якім камандаваў Яўген Філіпскіх. Расказваюць і пра здраднікаў, якія спрыялі фашыстам у іх крывавых справах. Асобныя старонкі кнігі — пра Соф'ю Лі, яе мужа Уладзіміра Сухаверхава, іх сына Германа Лі. Сям'я мастакоў ваявала ў складзе партызанскай брыгады «Полымя». І Соф'я Дзмітрыеўна, і Уладзімір Паўлавіч першыя месяцы вайны знаходзіліся ў Беразянцы. Калі прыйшлі ў лес да народных мсціўцаў, займаліся і баявой работай, не забываліся, што яны — творчыя людзі. Уладзімір Сухаверхаў афармляў раённую падпольную газету «Партизан Белоруссии». За ўдзел у партызанскім руху, за канкрэтныя баявыя здзяйсненні муж і жонка адзначаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі «Партызану Айчыннай вайны» І ступені. У кнізе — і пра Яніну Крайнік, партызанскую паэтэсу, якая адгукнулася на трагедыю паэмай "Якубу Коласу (голас з Беразянкі)»: «Дарагі Канстанцін Міхайлавіч! // З пажаўцелых кутоў ды з халоднай зямлянкі // Рвецца голас к табе, дарагі наш пясняр. // Голас тых, хто застаўся жывы з Беразянкі, // Расказаць, што зрабіў з ёю чужынец-дзікар...» Чаму паэтэса звярнулася да народнага паэта Беларусі?.. Якуб Колас у перадваенныя гады разам з сям'ёю адпачываў у Беразянцы, пісаў у гэтых мясцінах свае творы. Ведаў усе клопаты і ўсе трывогі беразянкаўцаў...

Кніга Аляксандра Плавінскага і Андрэя Шавеля «Беразянка» — сапраўдны падручнік патрыятычнага выхавання маладых людзей. Асабліва прыдатнай павінна быць іх праца ў навучальных установах Мар'інай Горкі Пухавіцкага раёна. На старонках выдання, напоўненага дакументамі, ілюстрацыямі, успамінамі, выразна прасочваецца лінія захавання нашчадкамі памяці пра генацыд нашага народа, пра боль, пра мужнасць нашых прашчураў. Нераўнадушша многіх пухавічан, дзяцей і ўнукаў беразянкаўцаў, — прыклад таго, як беларусы ставяцца да гісторыі, ваеннай памяці.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «МАРАФОН ТРАНЗАКЦИЙ»

**1.** Настоящие Правила проведения рекламной игры «Марафон транзакций» (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 г. № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Марафон транзакций» (далее – Рекламная игра).

**2. Сведения об организаторе**

Организатором Рекламной игры является ООО «РЕФОРТЕ» (далее – Организатор) с местом нахождения по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пл. Свободы, д. 4, офисное помещение № 334; УНП 100422707; электронный адрес: post@forte.by.

**3. Наименование Рекламной игры:** «Марафон транзакций».

**4. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**5. Срок начала и окончания Рекламной игры, включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения Рекламной игры:**

5.1. Срок начала Рекламной игры: 25 октября 2023 г.

5.2. Срок окончания Рекламной игры: 31 января 2024 г.

**6. Товары (работы, услуги), в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра**

Рекламная игра проводится в целях стимулирования использования банковских платежных карточек международной платежной системы Mastercard, эмитированных ЗАО «БСБ Банк» (далее – Карта).

В Правилах термин «банковская платежная карточка» используется в значении, определенном статьей 45 Закона Республики Беларусь от 19.04.2022 № 164-З «О платежных системах и платежных услугах»: «Банковская платежная карточка – платежный инструмент, обеспечивающий доступ к счету субъекта платежных правоотношений для получения наличных денежных средств и осуществления расчетов в безналичной форме, а также обеспечивающий проведение иных операций в соответствии с законодательством».

**7. Комиссия по проведению Рекламной игры**

Организатором формируется комиссия по проведению Рекламной игры (далее – Комиссия). Комиссия осуществляет контроль за соблюдением установленных Правил проведения Рекламной игры, проводит отбор Участников Рекламной игры и розыгрыш Призового фонда, рассматривает возникшие споры при проведении Рекламной игры.

Состав Комиссии:

1. Даниленко Ольга Михайловна – специалист по рекламе ООО «РЕФОРТЕ» (председатель комиссии);

2. Кричковская Светлана Владимировна – главный бухгалтер ООО «РЕФОРТЕ»;

3. Шабунько Анна Георгиевна – специалист по работе с клиентами ООО «РЕФОРТЕ»;

4. Шуляк Валерия Сергеевна – маркетолог департамента маркетинга ЗАО «БСБ Банк»;

5. Черноок Юлия Владимировна – начальник департамента контроля и стандартов качества обслуживания клиентов ЗАО «БСБ Банк».

**8. Участники Рекламной игры**

К участию в Рекламной игре допускаются совершеннолетние (достигшие 18 лет), постоянно проживающие на территории Республики Беларусь граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, давшие путем проставления отметки на интернет-сайте Рекламной игры: marafon.bsb.by (далее – Сайт) согласие на участие в Рекламной игре и согласие на обработку своих персональных данных в целях проведения настоящей Рекламной игры. При этом отзыв Участником своего согласия на обработку персональных данных и (или) заявление им требования прекращения обработки своих персональных данных и (или) их удаления в период проведения Рекламной игры является основанием для прекращения участия данного Участника в Рекламной игре с лишением его права на получение выигранного им приза.

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства, лица, состоящие в трудовых отношениях с ЗАО «БСБ Банк» (далее – Банк), а также члены комиссии по проведению Рекламной игры.

**9. Призовой фонд Рекламной игры**

Источником формирования призового фонда Рекламной игры являются денежные средства и имущество Организатора. Размер призового фонда составляет 99 430,31 (девяносто девять тысяч четыреста тридцать белорусских рублей тридцать одна копейка) белорусских рублей.

*Состав призового фонда (Таблица № 1):*

| № | Наименование выигрыша (приза) | Стоимость за 1 шт., рублей | Количество | Итого, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Сертификат на разовое посещение акватермальной зоны Falcon Club SPA на 2 персоны, со сроком действия с 01.10.2023 г. по 01.04.2024 г. (6 мес.)<br>(для использования указанного сертификата Победителю необходимо обратиться в ООО «ФЭЛКОН ИНВЕСТМЕНТ» по адресу: г. Минск, просп. Победителей, дом 20, тел. +375 44 771 00 78; условия использования сертификата указаны на сайте https://falconclub.by/chlenstvo-v-klube/individualnoe/),<br>а также 8,07 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза,<br>именуемый далее – «Бонусный приз» | 248,07 | 100 | 24 807,00 |
| 2 | Клубная карта Falcon Club Gold SPA на 3 месяца со сроком активации с 01.11.2023 г. по 01.04.2024 г., включающая:<br>- членство Falcon Club;<br>- неограниченное количество посещений акватермальной зоны СПА-клуба, тренажерного зала и бассейна Минск Марриотт Отель;<br>- 1 гостевой визит (согласно Правилам Клуба). Гостевой визит включает посещение в течение одного дня: Фитнес клуба, СПА-клуба (не более 4 часов) и Академии сквоша и тенниса (1 час игры);<br>- предоставление в пользование полотенца, халата;<br>- заморозка: 7 дней;<br>- возможность пользования крытой парковкой (во время пребывания в комплексе)<br>(для использования указанной клубной карты Победителю необходимо обратиться в ООО «ФЭЛКОН ИНВЕСТМЕНТ» по адресу: г. Минск, просп. Победителей, дом 20, тел. +375 44 771 00 78; условия использования клубной карты указаны на сайте https://falconclub.by/chlenstvo-v-klube/individualnoe/),<br>а также 115,66 белорусского рубля, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза,<br>именуемая далее – «Приз 1» | 1 075,66 | 30 | 32 269,80 |
